№ 39 (493) 27 кастрычніка 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы




## Кніга патрыярха

**Віленскі Інстытут беларусістыкі выдаў 900-старонкавы збор твораў выдатнага гісторыка Юр'я Туронка. Старонка 15.**

## Расея, чамадан, вакзал

Расейскі палітоляг заклікаў дэпартаваць беларусаў. **Старонка 3.**

Ці магчымы сцэнар канфлікту між Расеяй і Беларусьсю, апісаны Андрэем Суздальцавым? Адказваюць **Юлія Слуцкая, Віктар Марціновіч, Аляксандар Грыцанаў. Старонка 4.**

## «Урокі беларускай мовы» цяпер і ў Менску

23 кастрычніка адбылася прэзэнтацыя фільму польскага рэжысэра Міраслава Дэмбінскага «Урокі беларускай мовы. Моладзь супраць Лукашэнкі». Стужку ўжо закупілі тэлеканалы Польшчы, Нямеччыны, Эстоніі, Латвіі, Літвы. **Старонка 13.**




## Пуцін пагражае абмежаваць пастаўкі нафты ў Беларусь

У часе прамой лініі з грамадзянамі Расеі Уладзімер Пуцін рэзка выказаўся на адрас Беларусі. **Старонка 9.**



## Суд над Дашкевічам будзе закрытым

Працэс распачнецца ў Кастрычніцкім судзе сталіцы 30 кастрычніка. **Старонка 6.**

## Гісторыя трох дзён

Турэмны дзёньнік Зьмітра Дашкевіча. **Старонка 6.**

## Бацька Дашкевіча: «Дадуць майму Зьмітру па поўнай»

Напярэдадні працэсу Дашкевіча карэспандэнт «НН» пагутарыў з бацькам юнака. **Старонка 7.**




Юлія Дарашкевіч

# у нумары


## люстра дзён

Ці магчымы сцэнар, апісаны Андрэем Суздальцавым? .. 4

Крытычная стадыя .............. 4

Эўрасаюз рыхтуе глебу для перамоваў зь Беларусьсю .................... 5

Казулін і Скрабец абвесьцілі галадоўку .......... 5

Пуцін пагражае скараціць пастаўкі нафты для Беларусі 9

Украіне газ пойдзе за $130 .................................... 9

Расейскі актор Садальскі папрасіў грамадзянства Грузіі ........................................ 9

Старшынём Саюзу пісьменьнікаў застаўся Пашкевіч ............................... 9

Хроніка ................................ 10

Аб усім патроху ............... 12

## воля і пятля

Суд над Дашкевічам будзе закрыты ..................................... 6

Зьміцер Дашкевіч. Гісторыя трох дзён ................................... 6

Бацька Дашкевіча: «Дадуць майму Зьмітру па поўнай» .... 7

Кацярыну Садоўскую асудзілі на 2 гады ................................. 11

## камэнтары

Павал Севярынец. Мова свабоды ................................. 10

Аляксандар Класкоўскі. Ці здох воўк? ............................. 16

## культура

«Урокі беларускай мовы» цяпер і ў Менску .................. 14

Сьвята паэзіі на радзіме Сыса .................. 14


АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

# Хто вы паводле веравызнаньня, чытач?

Такое пытаньне задалі мы наведнікам сайту nn.by. Аказалася, што чытач «НН» пабожнейшы за сярэднестатыстычнага беларуса. Ня вераць у Бога або не належаць ні да якой канфэсіі 19,7% аўдыторыі ніўскага сайту, прытым што сацыёлягі адносяць да такіх каля 50% насельніцтва краіны.

Доля пратэстантаў (7,2%) і асабліва ўніятаў (9,2%) у нашым чытацтве большая, чым у сярэднім у краіне. Гэта ілюструе прыхільнасьці беларускакультурнай і сацыяльна актыўнай часткі насельніцтва, якая і складае нашу аўдыторыю.

Беларускія мусульмане застаюцца прысутнымі як група.

Трэба адзначыць, што опцыі «юдэй» і «паганец» мы дадалі толькі на пяты дзень апытаньня, улічыўшы заўвагі інтэрнаўтаў. Таму, імаверна, доля чытачоў гэтых вызнаньняў большая, чым дэманструе табліца.

А пераважаюць між нас праваслаўныя хрысьціяне.

| | |
|---|---|
| Праваслаўны | 113 (37.0%) |
| Каталік | 66 (21.6%) |
| Грэка–каталік (уніят) | 28 (9.2%) |
| Пратэстант | 22 (7.2%) |
| Мусульманін | 5 (1.6%) |
| Юдэй | 1 (0.3%) |
| Паганец | 0 (0.0%) |
| Я ў Бога веру, але ні да якой канфэсіі не належу | 33 (10.8%) |
| Я ў Бога ня веру | 27 (8.9%) |
| Ды інтэрнаўт я! | 10 (3.3%) |

Усяго прагаласавала на 20.00 25 кастрычніка: 305

# Зварот у справе Дашкевіча

Незарэгістраваны Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» распаўсюдзіў зварот да грамадзкіх арганізацыяў і рухаў, бацькоў, прэсы і міжнароднай супольнасьці.

Ён заклікаў да праяўленьня салідарнасьці з палітрэпрэсаванымі ўсімі магчымымі спосабамі.

КАРС нагадвае, што 30 кастрычніка ў 11.00 у судзе Кастрычніцкага раёна (вул.Сямашкі,33), будзе разглядацца справа Зьмітра Дашкевіча.

Прыводзяцца зьвесткі: ад пачатку году вынесена 13 крымінальных прысудаў на пазбаўленьне волі па палітычных матывах, узбуджана 94 крымінальныя справы, асуджана на шматсутачнае зьняволеньне ў турме 797 чалавек. За паўгоду выключаныя або падпалі пад ціск 393 студэнты, 49 асьпірантаў і магістрантаў.

Больш пра гэта можна прачытаць на сайце nn.by.

**Мікола Бугай**

# 29 кастрычніка — шэсьце памяці ў Курапаты

Кансэрватыўна–Хрысьціянская партыя – БНФ атрымала дазвол гарадзкіх і абласных уладаў на правядзеньне мэмарыяльнага мітынгу і шэсьця, прысьвечаных Дзядам – дню памінаньня продкаў.

Збор у нядзелю а 10.30 на бульвары Талбухіна каля станцыі мэтро «Парк Чалюскінцаў». З 11.30 да 14.30 – шэсьце па праспэкце Незалежнасьці, вуліцах Каліноўскага, Сядых, Карбышава, Гамарніка і Мірашнічэнкі да акружной дарогі. З 14.30 да 17.00 пройдзе мэмарыяльны мітынг ва ўрочышчы Курапаты, на месцы савецкіх масавых расстрэлаў.

# Расея, чамадан, вакзал

Расейскі палітоляг заклікаў дэпартаваць беларусаў.

Расейскі палітоляг Андрэй Суздальцаў падрыхтаваў для сайту «Аквілон» аналіз апошніх дзеяньняў беларускага кіраўніцтва. Гэты тэкст трапіў у распараджэньне беларускага Агенцтва фінансавых навінаў.

А.Суздальцаў пасьлядоўна праводзіць у ім паралелі між дзеяньнямі Міхаіла Саакашвілі і А.Лукашэнкі. І той, і той, на думку А.Суздальцава, імкнучыся ўмацаваць самастойнасьць сваіх дзяржаваў, праводзяць фанабэрыстую, правакацыйную ў дачыненьні да Расеі палітыку. Рэкамэндацыя палітоляга кіраўніцтву Расеі: «Шматгадовая ... палітычная, эканамічная, фінансавая, рэсурсавая, рынкавая, міжнародная і вайскова-стратэгічная падтрымка беларускага рэжыму праваліліся. ... Мы маем разбэшчаны ад беспакаранасьці суб'ект міжнароднага права, які дэманструе ненаедныя жаданьні далейшай каляніяльнай эксплюатацыі Расеі».

А.Суздальцаў прапануе ставіцца да Беларусі выключна прагматычна: «Беларусь нам не саюзьнік, а проста наняты за 7 млрд даляраў у год ... ільгот і прывілеяў геапалітычны ландскнэхт. Як Захад дасьць больш, дык адразу беларускі жаўнер апынецца ў Іраку», — мяркуе А.Суздальцаў.

Ён называе цяперашнюю Беларусь «наймітам» і прапануе ставіцца да яе як да наймітa: «кантракт з дакладнымі фармулёўкамі функцыяў дарожна-паставой службы і колькасьці памежных дазораў».

А.Суздальцаў прадбачыць прыняцьце Беларусьсю дзеяньняў у сваю абарону ў выпадку эканамічнага ціску Расеі. У адказ ён прапануе тры кірункі дзеяньняў.

Першы мусіць быць скіраваны на рашэньне стратэгічных задачаў — рэвізія саюзных дамоўленасьцяў, абсьледаваньне комплексу пытаньняў, зьвязаных з эканамічнай і энэргетычнай інтэграцыі зь Беларусьсю і стварэньнем на базе састарэлай трубы «Белтрансгазу» супольнага прадпрыемства.

Другі блёк — тактычны. У А.Суздальцава няма сумневаў у тым, што А.Лукашэнка, адкінуўшы прапановы «Газпрому», увогуле перастане плаціць за газ. Таму А.Суздальцаў гаворыць пра неабходнасьць інвэнтарызацыі беларускай уласнасьці, у першую чаргу нерухомасьці на расейскай тэрыторыі. «Варта прадумаць меры блякаваньня і нават канфіскацыі фінансавых актываў беларускай дзяржавы ў расейскіх банках, рухомай маёмасьці, доляў у акцыянэрных таварыствах, транспартных сродкаў». Асобная праца — падрыхтоўка інфармацыйнай вайны, піша А.Суздальцаў.

«Супраца ў галіне ВПК мусіць быць падрыхтаваная да замарожваньня. Гандаль зброяй — згорнуты. Допускі да сакрэтаў перагледжаныя. Асаблівую ўвагу надаць беларускаму лобі ў Маскве. Мы павінны жорстка папярэдзіць лобі, што не пацерпім, на ўзор грузінскай дыяспары, фармаваньня «пятай калёны» А.Лукашэнкі на расейскай тэрыторыі».

Трэці блёк павінен складацца з тэрміновых мераў супрацьдзеяньня ў бліжэйшы месяц. Сярод іх — увядзеньне «пашпартна-памежнага кантролю на аўтамагістралях і на чыгунцы зь беларускага напрамку».

А.Суздальцаў прапануе ажыцьцяўляць паказальныя дэпартацыі беларусаў, «якія сябе «адзначылі», улучна з рэжысэрамі групы Беларускага тэлебачаньня ў Маскве. Пажадана абвясьціць і распачаць кампанію рэгістрацыі беларускіх грамадзянаў, якія працуюць на тэрыторыі Расеі без афармленьня працоўнага пагадненьня і якія атрымліваюць зарплату ў «капэртах», што парушае расейскае працоўнае заканадаўства».

А.Суздальцаў называе А.Лукашэнку знаным «сваім імпульсіўным прыняцьцем простых рашэньняў», таму расейскаму боку прапануецца «падумаць пра меры дзеля тэрміновага перакрыцьця заходняга сэктару супрацьпаветранай абароны» з выкарыстаньнем «расейскага аналягу сыстэмы «АВАКС» Таксама «мусяць быць прынятыя тэрміновыя меры дзеля ... аўтанамізацыі расейскіх баз на тэрыторыі РБ...»

Поўны тэкст артыкулу можна прачытаць на сайце www.afn.by.

Варта нагадаць, што гэтага расейскага аналітыка ўзімку гэтага году КДБ Беларусі самога дэпартавала з тэрыторыі нашай краіны.

**Сямён Печанко**



**Андрэй Суздальцаў працуе аналітыкам ў шэрагу маскоўскіх інстытутаў.**



KOMMERSANT.RU

**У сустрэчы А.Лукашэнкі з Ільхамам Аліевым расейская прэса пабачыла імкненьне Беларусі зблізіцца з краінамі энэргетычнага пакту ГУАМ. На перамовах абмяркоўвалася магчымасьць паставак нафты ў Беларусь праз Чорнае мора.**

# Крытычная стадыя

Тры тыдні доўжыцца галадоўка–пост у царкве «Новае жыцьцё».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

21 кастрычніка на плошчы Бангалор прайшоў дазволены гарадзкімі ўладамі мітынг у падтрымку царквы «Новае жыцьцё». На акцыю сабралася каля тысячы чалавек з розных гарадоў Беларусі. Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю. У ёй, апрача патрабаваньняў вярнуць будынак царквы вернікам і надаць яму статус культавага, прагучала патрабаваньне зьменаў у Закон аб свабодзе веравызнаньня. Цяперашні варыянт закону, на іх думку, носіць дыскрымінацыйны характар, бо пазбаўляе вернікаў права на свабоду выбару месца богаслужэньня.

25 кастрычніка вернікі царквы «Новае жыцьцё» зьвярнуліся ў Пракуратуру з просьбай прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці аўтара і ўдзельнікаў паказаных тэлеканалам СТБ сюжэтаў: супрацоўніцу Людмілу Джураеву, кіраўнічку аддзелу ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Менгарвыканкаму Алу Рабіцаву і кандыдата гістарычных навук Івана Янушкевіча.

Згодна зь беларускім заканадаўствам, 19 кастрычніка царква падала заяву з патрабаваньнем да кіраўніцтва СТБ разьмясьціць абвяржэньне непраўдзівай інфармацыі пра царкву «Новае жыцьцё», што прагучала ў выпусках навінаў 14 і 15 кастрычніка.

Канчатковае рашэньне зьвярнуцца ў пракуратуру было прынятае пасьля тэлефоннай гутаркі з праўнікам тэлеканалу Галінай Дварцовай, якая заявіла: «Пішэце куды хочаце. Нас гэта не хвалюе».

Няма дагэтуль адказу на скаргу, пададзеную у Вышэйшы гаспадарчы суд восем дзён таму. Паводле інфармацыі кіраўніцтва царквы, за разгляд скаргі ніхто яшчэ ня браўся. Вернікі даслалі ў Адміністрацыю прэзыдэнта і Гаспадарчы суд яшчэ адзін зварот. 27 чалавек зь ліку галадоўнікаў абвесьцілі пра гатовасьць пратэставаць датуль, пакуль гэтае пытаньне ня вырашыцца.

Галадоўнікі старэйшага веку выходзяць з акцыі пратэсту з прычыны абвастрэньня сардэчна-судзінных захворваньняў. У аўторак шпіталізавалі найстарэйшую ўдзельніцу пратэсту — 60-гадовую Натальлю Іванову. Дактары паставілі ёй дыягназы гіпертэнзія, брадыкардыя ды ішэмія.

У сераду шпіталізавалі ўдзельніцу акцыі пратэсту, якая прагаладала 16 дзён, Тацяну Варанцову. Як і Натальлю Іванову, яе адвезьлі ў 1-ю клінічную больніцу.

Галадоўка ўвайшла ў крытычную стадыю, калі ўзьнікае пагроза незваротных зьменаў у арганізьме галадоўнікаў. Тым часам улады па-ранейшаму маўчаць.

**СП**

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

### Ці магчымы сцэнар канфлікту між Расеяй і Беларусьсю, апісаны Андрэем Суздальцавым?

Артыкул расейскага палітоляга Андрэя Суздальцава: правакацыя, дэманстрацыя сілы ці праўдзівы прагноз будучага беларуска-расейскага крызісу? Ці скарыстаецца Масква з парадаў Суздальцава? Адказваюць супрацоўнікі і аўтары расейскамоўных выданьняў, зьвязаных з маскоўскімі выдавецкімі групамі.

**Віктар Марціновіч, намесьнік рэдактара «БелГазеты»:** Па-першае, трэба зьвярнуць увагу на асобу А.Суздальцава. Яшчэ да дэпартацыі беларускім КДБ шэраг экспэртаў уважалі яго за лабіста інтарэсаў буйных расейскіх энэргетычных кампаніяў. Цяпер ён, да ўсяго, расейскі палітоляг. Таму ўсе ягоныя заявы трэба разглядаць менавіта ў такім кантэксьце. Змрочныя фарбы ягонага артыкулу — гэта ўсё псыхалягічныя моманты. Масква словамі Суздальцава дае зразумець, што Беларусь павінна прыняць яе ўмовы і прапановы. Расею ў першую чаргу цікавіць эканоміка — прыватызацыя «Белтрансгазу» ды ўвогуле буйных прамысловых прадпрыемстваў Беларусі. Таму прапанаваныя Суздальцавым меры ў супрацьдзеяньні Лукашэнку задзейнічаныя ня будуць. Ня варта шукаць паралеляў з грузінска-расейскім канфліктам і чакаць падобнага разьвіцьця падзеяў у беларуска-расейскіх дачыненьнях. Лукашэнка выклікае зусім іншую, істотна меншую, ступень раздражненьня ў свайго расейскага партнэра. Дэпартацыя грузінаў вітаецца бальшынёй масквічоў і піцерцаў, што тлумачыцца іх сталай непрыязнасьцю да каўказцаў. Дэпартацыя хоць бы аднаго беларуса з Расеі выкліча там адваротны эфэкт. Масква на такое ніколі ня пойдзе.

**Аляксандар Грыцанаў, калюмніст «БелГазеты»:** Суздальцаў дакладна апісаў сёньняшнія праблемы ў дачыненьнях паміж Беларусяй і Расеяй. Што да магчымай рэакцыі Крамля, дык я ўпэўнены: аніяк Масква з гэтых прапановаў не скарыстае. Цяпер у Расеі пры ўладзе ня тыя людзі, каб маглі пайсьці на такія радыкальныя дзеяньні. Крэмль бюракратызаваны і крыміналізаваны.

**Юлія Слуцкая, галоўная рэдактарка газэты «Комсомольская правда в Беларуси»:** Абсалютна немагчыма, каб спраўдзіўся гэткі сцэнар. Расея ніколі ня пойдзе на такія жорсткія меры супраць свайго саюзьніка. Трэба разумець, што на працягу ўсёй сучаснай гісторыі беларуска-расейскіх дачыненьняў вядуцца такога кшталту гульні. І гэтую заяву Суздальцава таксама трэба разумець як элемэнт гульні. Але Расея не гатовая страціць такога суседа, якім бы ён ні быў. Таму гэтыя парады, калі і спраўдзяцца, то выключна на ўзроўні дэманстрацыі. Глыбінныя ж працэсы будуць ісьці сваім вызначаным шляхам.

**Запісаў Сямён Печанко**

# Эўрасаюз рыхтуе глебу для перамоваў зь Беларусьсю

Ізноў пашыраны сьпіс беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у Эўропу.

Пашыраны сьпіс супрацоўнікаў беларускай адміністрацыі, якім забаронены ўезд на тэрыторыю Эўрапейскага Зьвязу. У «навабранцах» — два судзьдзі і два пракуроры. Тыя, што спрычыніліся да ўвязьненьня актывістаў «Партнэрства» — арганізацыі па назіраньні за выбарамі, якую ўлады спачатку не далі зарэгістраваць, а пасьля разграмілі. А таксама тыя, што ўдзельнічалі ў працэсе над экс-кандыдатам у прэзыдэнты, лідэрам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандрам Казуліным.

Такім чынам, усяго ў сьпісе неўязных у Эўропу цяпер стала 41 прозьвішча.

Прысуд Аляксандру Казуліну вынес судзьдзя Маскоўскага раёну Менску Аляксей Рыбакоў (пяць з паловай гадоў калёніі агульнага рэжыму), пракурорам на працэсе выступаў Сяргей Бортнік (патрабаваў шасьці гадоў зьняволеньня).

Сьпіс папоўнілі таксама судзьдзя Цэнтральнага раёну Менску Леанід Ясіновіч і пракурор Андрэй Мігун, які выступаў абвінаваўцам у працэсе «Партнэрства». Тады былі асуджаныя чатыры юнакі. Мікола Астрэйка і Цімох Дранчук дагэтуль застаюцца за кратамі.

На сайце www.charter97.org беларускія праваабаронцы заклікалі распаўсюдзіць сымбалічную забарону на ўезд у ЭЗ на пракурора Натальлю Талаш і судзьдзю Ленінскага раёну Менску Тацяну Жулкоўскую, якія ўчора засудзілі да двух гадоў турмы 60-гадовую Кацярыну Садоўскую. Віна яе палягала ў сачыненьні звароту да грамадзкасьці з заклікам да псыхіятрычнае экспэртызы А. Лукашэнкі, а таксама, нібыта, у тэлефонных пагрозах судзьдзі.

Апошнія тыдні множыліся чуткі пра гатоўнасьць Менску да нармалізацыі стасункаў з Эўропай. Вянцом іх стала таямнічая сустрэча Віктара Канаплёва і Рэнэ ван дэр Ліндэна ў Маскве. Першы — старшыня палаты прадстаўнікоў і блізкі сябар беларускага кіраўніка. Другі — старшыня Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы. Пад акампанэмэнт чутак у беларускай сталіцы працягваліся пасьпешлівыя судовыя працэсы над дысыдэнтамі. Рашэньне Брусэлю пра пашырэньне візавых санкцыяў рыхтавалася даўно і абмяркоўвалася з Аляксандрам Мілінкевічам падчас візыту апошняга ў Фінляндыю, якая цяпер старшынюе ў эўрапейскай супольнасьці. Яно мае на мэце паказаць, што эўрапейцы болей ня вераць абяцанкам-цацанкам.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Эўразьвяз зьвярнуў увагу на беларускіх судзьдзяў. На фота: Аляксей Рыбакоў падчас працэсу Казуліна.**

**Мікола Бугай**

# Казулін і Скрабец абвесьцілі галадоўку

Паводле праваабаронцы Алега Волчака, супрацоўнік калёніі «Віцьба-3», які сябе не назваў, пацьвердзіў, што Аляксандар Казулін і Сяргей Скрабец не ізаляваныя, яны працягваюць працаваць, але ежы не прымаюць.

Тое, што да галадоўкі Аляксандра Казуліна зьбіраўся далучыцца былы дэпутат Сяргей Скрабец, пацьвердзіла жонка палітыка Аляксандра Скрабец. Яна спаслалася на ліст ад мужа, што прыйшоў напярэдадні.

Экс-кандыдат на прэзыдэнта Аляксандар Казулін, якога пасьля выбараў асудзілі на 5,5 году астрогу, пачаў галадоўку 20 кастрычніка. Палітык пратэстуе супроць незаконнага, як ён мяркуе, знаходжаньня ва ўладзе Аляксандра Лукашэнкі і дамагаецца разгляду «беларускага пытаньня» ў Радзе бясьпекі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Паводле радыё «Свабода»**




WWW.SVABODA.ORG

**Мітынг падтрымкі Аляксандра Казуліна ў Магілёве.**

# Лукашэнка наведае Іран

Кіраўнік зьнешнепалітычнага ведамства Беларусі абмеркаваў з прэзыдэнтам Ірану Магмудам Агмадынэджадам візыт прэзыдэнта Беларусі ў Тэгеран, які мае адбыцца найбліжэйшым часам.

**Паводле Telegraf.by**

# Суд над Дашкевічам будзе закрыты

Суд над Зьмітром Дашкевічам распачнецца 30 кастрычніка аб 11-й. Ён будзе праходзіць у закрытым рэжыме. Справу мае разглядаць намесьніца старшыні суду Кастрычніцкага раёну Менску судзьдзя Ала Булаш.

Праваабаронцы маюць свой погляд на матывацыю закрытасьці будучага суду. Гэта нежаданьне грамадзкага розгаласу і афішаваньня сёньняшніх сьледчых тэхнялёгіяў, што практыкуюць беларускія праваахоўнікі ў дачыненьні да палітычных апанэнтаў уладаў. Тым ня менш, праваабаронцы, сябры і паплечнікі З. Дашкевіча заклікаюць усіх неабыякавых да салідарнасьці з палітвязьнем і прапануюць прыйсьці 30 кастрычніка да будынку суду на вул.Сямашкі, 33 падтрымаць яго.

Арыштавалі Зьмітра 15 верасьня, калі ён разам з адвакатам зьявіўся на допыт у пракуратуру. Здарылася гэта пасьля яго вяртаньня з Магілёва, дзе сустрэчу мясцовых маладзевых актывістаў перарваў спэцназ. Хлопца абвінавацілі ва ўдзеле й кіраваньні незарэгістраванай арганізацыяй «Малады фронт».

Паводле артыкулу 193 ч.1 КК, яму пагражае да двух гадоў пазбаўленьня волі. Пасьля арышту яго зьмясьцілі ў СІЗА Менску па вул. Валадарскага, ня гледзячы на тое, што гэты артыкул не прадугледжвае ўтрыманьня пад вартай да суду: маладога чалавека палічылі небясьпечным для грамадзтва. 21 верасьня яму было прад'яўлена афіцыйнае абвінавачаньне.

З Валадаркі Зьміцер дасылае лісты. Зь іх стала вядома, што яму не перадалі Біблію. Хлопец пагражаў распачаць галадоўку. Мець Біблію яму ўрэшце дазволілі, але высьветлілася, што ў адной зь ім камэры знаходзяцца хворыя на сухоты, гепатыт і ёсьць адзін ВІЧ-інфікаваны чалавек.

**Сямён Печанко**

# Гісторыя трох дзён

Турэмны дзёньнік **Зьмітра Дашкевіча.**

*Рэспубліка Беларусь.* Менск, вуліца Валадарскага, дом 2. На гэтым адрасе, у цэнтры гораду, каля Чырвонага касьцёлу й Дому ўраду, чатырохзоркавага гатэлю «Менск» і Драматычнага тэатру імя Горкага, пражывае дзьве з паловаю тысячы чалавек. І ўсё было б добра ў гэтай гісторыі, каб будынак той, у цэнтры сталіцы эўрапейскае краіны, ня быў бы турмою.

*Турма.* Нешта загадкава-небясьпечнае хаваецца ў гэтым слове для чалавека, які ніколі ў жыцьці ня быў абмежаваны воляю. А нават калі й бываў наш брат на якім Акрэсьціна, ня можа сабе ўявіць, што хаваецца за старажытнымі мурамі Пішчалаўскага замку.

Не, тут зусім ня страшна. Жывуць нават гадамі, у гэтых тубэркулёзных, насьмерць пракураных камэрах, якія на матчынай мове ласкава называюцца «хаты», нібы падкрэсьліваючы кожнаму новаму наведвальніку цэнтралу — твой дом цяпер тут, тут цяпер твая хата. І што самае цікавае — жыцьцё тут ідзе таксама паводле законаў. Толькі паводле сваіх.

*Зладзейскія законы.* Зрэшты, любая чалавечая супольнасьць схільная да фармаваньня законаў для сваёй жыцьцядзейнасьці. Працэс гэты неабходны й пазытыўны. Ствараючы законы супольнасьцю як жаданьне ўпарадкаваць ці абмежаваць дзейнасьць сваіх прадстаўнікоў.

Тое самае адбылося ў супольнасьці людзей, што пазбаўленыя волі, — зэкаў. Фармулюючы свае законы, яны клапаціліся пра жыцьцядзейнасьць сваёй сыстэмы ў супрацьстаяньні зь іншаю сыстэмай — міліцэйскаю (ці мусарскою, як яе называюць тут). Сэнс супрацьстаяньня — лібэралізаваць апошнюю й зрабіць яе больш прыдатнаю для жыцьця. Ну, да прыкладу, носьбіты зладзейскай маралі дамагаюцца ад адміністрацыі турмаў, каб палёгкі — пашырэньня колькасьці дазволеных перадачаў, дазволу карыстацца электрычнасьцю, тэлевізарам, фармуюць абшчакі для дапамогі тым, хто, заехаўшы ў турму, нічога ня мае, і г.д.

**Працяг на старонцы 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



Вячаслаў Дашкевіч ля варотаў Валадаркі.

# Бацька Дашкевіча: «Дадуць майму Зьмітру па поўнай»

Напярэдадні працэсу Дашкевіча карэспандэнт «НН» пагутарыў з бацькам Зьмітра.

**«Наша Ніва»: Якім быў Зьміцер у дзяцінстве?**

**Вячаслаў Дашкевіч:** Звычайны быў хлопец, як усе дзеці. Любіў пабегаць, як падлеткам стаў, нешта пачасту майстраваў, маляваў.

**«НН»: Як у школе вучыўся, у настаўніцкі пакой Вас не выклікалі?**

**ВД:** Некаторыя настаўнікі казалі, што ён досыць неспакойны хлопец. Мог недзе і пабуяніць, але ня памятаю, каб праз гэта былі нейкія праблемы. Былая дырэктарка школы называла яго залатым дзіцём. Дадавала, што трэба толькі падыход да яго знайсьці.

**«НН»: Ці не назіралі Вы за ім ужо тады нейкіх лідэрскіх якасьцяў?**

**ВД:** Ды не, гэтым ён не вылучаўся. Я і цяпер за ім нічога такога не заўважаю. А ў палітыку яго, калі можна так сказаць, прывёў, мабыць, Павал Севярынец. З таго і пачалося, як разам 15 сутак адседзелі.

**«НН»: Калі Зьміцер стаў размаўляць па-беларуску?**

**ВД:** Як дзьвюхмоўе ўвялі. А да гэтага ён да мовы нэўтральна ставіўся. А потым лепш за мяне пачаў размаўляць.

Зьміцер Дашкевіч пачаў размаўляць па–беларуску пасьля ўвядзеньня ў краіне дзьвюхмоўя.

**«НН»: З Вашым сынам салідарныя праваабаронцы і моладзевыя арганізацыі сьвету, а як да яго арышту ставяцца Вашыя суседзі, сваякі?**

**ВД:** Сваякоў у нас тут няма, а суседзі ды знаёмыя нічога ня ведаюць. Ніхто тут не чытае «Нашай Нівы», «Народнай волі», ня слухаюць «Свабоды». Я й сам, калі ён не званіў нам, не пісаў, казаў яму нагадваць пра сябе. То пачуў: «Чытайце нашыя газэты ды «Свабоду» слухайце, там усё пра мяне даведаецеся».

**«НН»: Што чакаеце ад суду?**

**ВД:** Ня маю ілюзіяў: дадуць яму па поўнай. І ўся падтрымка не дапаможа. Такая мая думка.

**Гутарыў Сямён Печанко**

# Гісторыя трох дзён

**Працяг са старонкі 6.**

Ну, з законамі першае сыстэмы мы знаёмыя і неаднаразова выпрабоўвалі іх праз сваю скуру. Таму можам пагадзіцца з арыштанцкаю характарыстыкаю чалавечнасьці апошніх. А вось што датычыць зладзейскіх законаў, дык ня кожнаму шчасьціць азнаёміцца зь імі на сваім жыцьцёвым шляху.

*Адаптацыя*. Пачалася яна для мяне ў першым СІЗА Беларусі, у пятніцу. А тых, хто трапляе сюды ў апошні працоўны дзень і выходныя, трымаюць да панядзелка ў адстойніках. Адстойнікі — гэта такія спэцыялізаваныя камэры з драўлянымі насьцiламі замест полу, дзе прыбіральня (дальняк, ці даліна па-тутэйшаму) служыць адначасова рукамыйніцай. Гэта цяжкавата зразумець таму, хто не сутыкаўся з такою сыстэмаю. А яна вельмі простая: у куце камэры безь ніякіх загарадак знаходзіцца пляскаты ўнітаз, а над ім — кран з вадою. Вось такая эканамічная канструкцыя — два ў адным. Усё-ткі ўмеюць нашыя, калі захочуць.

Ну дык вось, адстойнік № адзін-дзевяць-восем (так тут заведзена агучваць лічбы), што стаўся мне домам на тры дні, меў плошчу каля 12 м$^2$, а запіхнуць туды прымудрыліся ажно 25 чалавек. Нават быў адзін арыштант, каторы праз гэтыя адстойнікі ўжо восем месяцаў езьдзіць на суд, дык казаў, што больш як 18 чалавек тут яшчэ ня бачыў. Але межы чалавечае выносьлівасьці ў гэткага кшталту ўстановах проста няма.

І ўжо ў адстойніку, як у любым памяшканьні камэрнага тыпу, дзе знаходзяцца носьбіты турэмнае ідэі, пачынаюць дзейнічаць зладзейскія законы й адпаведная герархія, у якой усім хочацца заняць лепшае месца.

*Месца ў сыстэме*. Кожны яго пачынае намацоўваць зь першых жа дзён, заварожана слухаючы зэкаў, што ўжо некалькі разоў прайшлі кола гэтага пекла: турма—этап—лягер. На месцы ж засвойваючы правілы паводзінаў, кожны ўяўляе сябе маральным аўтарытэтам. Ну, як мы з вамі зразумелі, тут свая мараль.

Чалавек, каторы мае ўстойлівы характар, даволі хутка абжываецца ў турэмнай сыстэме й падпарадкоўваецца яе законам. Чалавек жа слабавольны й бесхарактарны ў гэтай установе хутка ператвараецца ў выгнанца, якога будуць разводзіць і абсьмейваць. Ёсьць яшчэ адна катэгорыя арыштантаў. Гэта людзі, што паводле сваіх маральных стандартаў ня могуць прыняць законаў «сьвету злодзеяў» і таму ўваходзяць зь ім у непазьбежны канфлікт. Такіх індывідуўмаў знайсьці тут цяжка, але ж рэальна. Звычайна на гэтых людзей ажыцьцяўляецца фізычна-маральны ўціск, і чалавек альбо прымае правілы гульні, альбо ператвараецца ў таго ж выгнанца, над якім, праўда, менш сьмяюцца, але больш ненавідзяць.

Апынуўшыся ў іншай заканадаўчай сыстэме, я не задумваўся над сваім месцам у ёй. Ва ўплывовыя шэрагі не імкнуўся й ведаў таксама, што насесьці на мяне асабліва не патрапіць. Імкнуўся стаяць адасоблена ад мясцовых законаў, але адразу апынуўся ў супрацьстаяньні зь імі.

*Супрацьстаяньне*. Пытаньні ўзьніклі адразу ж, у адстойніку. Быў там адзін дзядок, крыху такі на сваёй хвалі, і, зайшоўшы ў камэру, меў неасьцярожнасьць дзеля адсутнасьці месца сесьці на падлогу. Тут і пачалі яго цкаваць — ты, маўляў, дзядок, апушчаны, сядзі каля дальняка, да іншых не дакранайся, еж асобна й г.д. Безумоўна, на тое глядзець цяжка, таму безь ніякіх ваганьняў я пачаў абараняць дзядулю. На пачатку мяне не зразумелі, потым на мяне абразіліся, а затым на мяне пачалі накідвацца. Чаго я толькі ні наслухаўся за тыя тры дні ад змагальнікаў за зладзейскую мараль — і што я прыдурак, і што сэктант, і што мяне, калі я не супакоюся, разам з гэтым дзедам у гарэм запішуць, ну й шмат іншых цікавых рэчаў. А што самае дзіўнае, дык гэта тое, што сядзяць гэтыя наваяўленыя барацьбіты зь бесчалавечнаю мусарскою сыстэмаю й разважаюць:

— Ну й падонкі мусара, — міліцыянт перацягнуў аднаму зь іх, калі нас вадзілі браць кроў, — зь людзей зьдзекуюцца, б'юць іх, прыніжаюць мінімальную чалавечую годнасьць.

І тут жа самі праз некалькі хвілінаў пачынаюць гнабіць дзеда, які панудзіўся падняцца з падлогі й пахадзіць па камэры.

— Хлопцы, — кажу я ім, — вы папракаеце міліцыянтаў у бесчалавечнасьці, а самі чым адрозьніваецеся ад іх? Адкуль у чалавека, які сам штодзённа церпіць зьнявагу, хапае сілаў зьняважаць іншых?

Арыштанты трохі прыціхлі й дзеда болей не чапалі.

*Жыцьцёвая выснова*. Канфлікт быў вычарпаны. Але я дагэтуль думаю: Госпадзе, дык як жа так уладкавана чалавечае сэрца, што, трапіўшы пад узьдзеяньне зла, не знаходзіць сілаў і жаданьня яго спыніць, а памножыўшы шматкроць, нясе гэтае зло іншым?

І ня трэба думаць, што гэта праблема таго месца, у якім я знаходзіўся. Проста ў экстрэмальных умовах чалавечыя якасьці й заганы маюць схільнасьць абвастрацца. Таму й сытуацыя такая, у тым ці іншым фармаце, але ёсьць паўсюль вакол нас. І калі мы агледземся, дык убачым, наколькі часта самі трапляем у гэты ланцуг, якім зло рухаецца ад аднаго чалавека да другога.

Апостал Павал ведаў гэтую схільнасьць чалавечых сэрцаў і папярэджваў нас: «Ня дайся, каб цябе перамагло зло, але перамагай зло дабром» (Рым 12:21). Гэтыя словы могуць падацца простымі, бо як часта мы чулі гэта ў сям'і, школе, чыталі ў філязофскіх кнігах. Але як цяжка бывае самому, у штодзённай практыцы, адказаць камусьці на зло дабром. А знайсьці ў сабе сілы зрабіць так можна толькі тады, калі крыніца Божай дабрыні й любові будзе жыць у нашым сэрцы: «Любасныя, будзем любіць адно аднаго, бо любоў ад Бога, і кожны, хто любіць, нарадзіўся ад Бога і ведае Бога. А хто ня любіць, не спазнаў Бога, бо Бог ёсьць любоў» (1 Яна 4:7—8).

І калі нехта з нас жадае спасьцігнуць Госпада, словы гэтыя мусяць быць нашымі арыенцірамі ў барацьбе са злом — як сыстэмы зладзейскай ці міліцэйскай, так і любой іншай. Бо толькі любоў можа перамагчы прасавецкую ідэалёгію й атэізм, дэспатыю й беззаконьне. Толькі любоў да бліжняга можа спыніць гэтае зло, што паўстала на нашай змучанай зямлі.

*Менск, Валадарка*

# Пуцін пагражае абмежаваць пастаўкі нафты ў Беларусь

У часе прамой лініі з грамадзянамі Расеі Пуцін адказаў на пытаньне, датычнае Беларусі.

У часе прамой лініі з грамадзянамі Расеі Уладзімер Пуцін адказаў на пытаньне датычнае Беларусі.

Пуцін сказаў: «Найперш нам трэба гаварыць пра эканамічную інтэграцыю. І ў сувязі з гэтым самым галоўным я лічу пераход на адзіную валюту. У сувязі з гэтым зьвяртаю ўвагу на тое, што мы ніяк не можам дамагчыся супольных стандартаў у пытаньні эканамічных мытаў, як па імпарце, гэтак і па экспарце. Пэўныя рэчы нас хвалююць. Мы бачым аб'ёмы сырой нафты, якія паступаюць на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы, бачым патрэбы самой рэспублікі і тое, колькі нафтапрадуктаў пастаўляецца потым за мяжу. Калі нам ня ўдасца дасягнуць угодаў, дык нам прыйдзецца ўводзіць нейкія абмежаваньні».

Як адзначалі эканамісты, рээкспарт нафтапрадуктаў стаў асноўнай крыніцай даходаў беларускага бюджэту. Нідэрлянды і Брытанія, асноўныя пакупнікі беларускіх саляркі й бэнзыну, раптоўна сталіся галоўнымі гандлёвымі партнёрамі.

На думку дасьледчыкаў з Інстытуту прыватызацыі й мэнэджмэнту, нафтавыя санкцыі Расеі мацней ударылі б па даходах бюджэту, чым магчымае павышэньне цэнаў на газ.

**Мікола Бугай**



# Украіне газ пойдзе за $130

Расея і Ўкраіна дамовіліся пра пастаўкі газу ў 2007 г. у аб'ёме ня менш як 55 млрд м$^3$ па цане, не вышэйшай за $130 за тысячу кубоў, паведаміў у аўторак прэм'ер-міністар Украіны Віктар Януковіч.

Вельмі імаверна, што для Беларусі газ будзе пастаўляцца па такой сама цане, як і для Ўкраіны.

**Украіна прапанавала «Белтрансгазу» свае газасховішчы**

Апэратар газатранспартнай сыстэмы Ўкраіны, дзяржкампанія «Укртрансгаз» абмяркоўвае зь «Белтрансгазам» магчымасьць захоўваньня прыроднага газу для беларускіх спажыўцоў ва ўкраінскіх сховішчах, гаворыцца ў паведамленьні ўкраінскай кампаніі.

«Укртрансгаз», які ўваходзіць у дзяржхолдынг «Нафтагаз», не раскрывае дэталяў магчымай угоды. Кіеў заявіў, што ўжо назапасіў у сховішчах больш за 25 млрд м3 газу, што гарантуе бесьперабойныя пастаўкі газу ўкраінскім спажыўцам і на экспарт.

Украіна мае 13 падземных сховішчаў газу агульнай магутнасьцю 32,3 млрд кубамэтраў. Сховішчы «Белтрансгазу» меншыя — яны зьмесьцяць каля 1 млрд кубамэтраў.

**«Взгляд. Деловые новости»**

# Эўрачыноўнікі ацэняць запатрабаванасьць альтэрнатыўных радыёстанцый

Пасол Нямеччыны ў Беларусі Марцін Гекер, знаходзячыся ў Горадні, заявіў: «Адна з галоўных мэтаў нашай паездкі — атрымаць уяўленьне пра супрацоўніцтва ў сумежных з ЭЗ раёнах. Мы ведаем, наколькі важна мець па суседстве радыёстанцыі, якія распаўсюджваюць непадцэнзурную, свабодную інфармацыю. Такія радыёстанцыі ўжо існуюць, да прыкладу, у Вільні і Беластоку. У Горадні мы гутарылі з журналістамі, якія жаліліся на вельмі нязначную падтрымку гэтых праграмаў. У мінулым ЭЗ ужо вылучыў нямала грошай на падобныя праекты. Думаю, Эўразьвязу цяпер варта ацаніць тое, якім попытам карыстаюцца так званыя альтэрнатыўныя радыёпраграмы».

**Паводле «Нямецкай хвалі»**



# Расейскі актор Садальскі папрасіў грамадзянства Грузіі

Расейскі актор Станіслаў Садальскі папрасіў даць яму грамадзянства Грузіі, перадае «Эхо Москвы». Паводле словаў консула грузінскага пасольства ў Маскве Зураба Патарадзэ, ён вырашыў падаць афіцыйную заяву на прысваеньне яму грамадзянства Грузіі, каб «падтрымаць у цяжкі момант грузінскі народ».

Паводле слоў Патарадзэ, ён ня бачыць перашкодаў для атрыманьня Садальскім грузінскага грамадзянства.

Раней паведамлялася, што некалькі маладых пецярбуржцаў вырашылі на знак салідарнасьці з Грузіяй памяняць прозьвішчы на грузінскія.

**Радыё «Эхо Москвы»**

# Старшынём Саюзу пісьменьнікаў пераабраны Пашкевіч


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

22 кастрычніка ў Менску прайшоў 15-ты Зьезд Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. На яго зьехаліся 275 літаратараў з 494, што ўваходзяць у Саюз.

Зьезд праходзіў у Менскім міжнародным адукацыйным цэнтры, бо Дом літаратара пісьменьнікам у залі адмовіў.

Зьезд адкрыў патрыярх літаратуры, народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Цёпла віталі дэпутаты госьця, старшыню Саюзу пісьменьнікаў Украіны, дэпутата парляманту Ўладзімера Яварыўскага.

Абсалютнай бальшынёй галасоў на пасаду старшыні Саюзу пераабралі Алеся Пашкевіча. Зьезд прыняў заявы ў падтрымку галадоўнікаў-пратэстантаў і Аляксандра Казуліна ды іншых палітзьняволеных.

**СП**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Мова свабоды

Малое Сітна — надзвычай маўклівая вёска. Жывую гаворку ці сьмех пачуеш рэдка. Постаці вяскоўцаў прыгорбленыя, вочы амаль заўжды долу, вусны падцятыя. Справы такія, што казаць няма чаго. Ціхарацца тут дзеля прыгнечанасьці, страху ды замаскаванага пад абыякавасьць адчаю.

Умовы, праца і звычкі ў сіценцаў рабскія. Прыкрыкне на іх начальства, бы пугай хвастане, плацяць капейкі, і возяць на працу то ў вахтоўцы без тармазоў, то ў адкрытым кузаве грузавіка, то ўвогуле ў закратаванай «тэхдапамозе», што ўзімку прамярзае да шэрані на сьценах. Вось Сітна й маўчыць.

Але, калі прыслухацца, з амаль магільнае цішы точацца гукі свабоды.

*Свабода* гучыць у тых сама менш чатырох сіценскіх хатах, дзе ловяць радыё «Свабода», і ў работніцкай бытоўцы, дзе зьмена сядае вакол прывезенага Вінцэсем Мудровым прымача, каб паслухаць «Праскі акцэнт».

Свабода гамоніць у *Белым Доме* (так тут называюць васьмікватэрны леспрамгасаўскі інтэрнат зь белае цэглы), дзе ў вітальні ў лесавіка Аляксандра наведнікаў сустракае плякат пачатку 1990-х са статуяй Свабоды й дзе насельнікі абмяркоўваюць, як памяняць мясцовую ўладу, што не рамантуе жытла, ня чысьціць студняў і не вывозіць сьмецьця.

Свабода вітае цябе пры сустрэчы зь сіценцамі дарослымі й дзецьмі, якія носяць белыя й чырвоныя значкі з крыламі «Я за свабоду!» — нягледзячы на заўвагі ўчастковага («ужо ў апазіцыю паўступалі?..») або дырэктаркі ў школе («што гэта за анцігасударсьцьвенная паліціка?!»).

Свабода сьпявае ў кампутарах ды плэерах тутэйшай маладафронтаўкі й хлопцаў зь лясьніцтва, што ўпадабалі «Песьні Свабоды»...

Па ўсёй краіне рух «За Свабоду» пакуль яшчэ не грыміць, не скандуе, не ракоча хорам — але ўжо растрэсквае тоўшчу немасьці дзясяткамі й сотнямі тысячаў пазыўных.

Свабода сыгналіць з тых вокнаў, дзе 16 дня кожнага месяца ўвечары запальваюцца сьвечкі. Свабода адгукаецца ў сэрцах тых беларусаў, хто зьбіраецца прыйсьці на суд у справе «Маладога фронту» ў якасьці *сьведкаў салідарнасьці*. Свабода падае голас нават з камэраў Зьмітра Дашкевіча, куды лідэра беларускай моладзі зьмясьцілі разам з хворымі на СНІД ды сухоты, Міколы Астрэйкі, у якога нарадзілася дзіця, Аляксандра Казуліна, які пачаў галадоўку

## ХРОНІКА

### Галадоўкі

Вернікі пратэстанцкай царквы **«Новае жыцьцё»** падалі скаргу ў Вярхоўны суд Беларусі на ўлады Менску, якія хочуць выселіць іх з храму. 21 кастрычніка вернікі зладзілі мітынг у Менску, у якім удзельнічалі каля 1000 чалавек.

19 кастрычніка да галадоўкі далучыліся **Рыгор Спасюк**, **Міхаіл Усьціновіч**, **Сяргей Гурло**, **Сяргей Сьмірноў**, **Уладзімер Масьлянчэнка**. Сама **Алена Захожая** абвесьціла «сухую галадоўку». Дырэктар заводу «Белшына» 20 кастрычніка задэкляраваў выплаціць сябрам недзяржаўнага прафсаюзу тыя ж грошы, што й афіцыйнаму, але рэгістраваць суполку адмовіўся.

20 кастрычніка пачаў галадоўку палітвязень **Аляксандар Казулін**. 23 кастрычніка стала вядома, што да галадоўкі далучыўся **Сяргей Скрабец**. Тым ня менш, палітвязьняў працягваюць вадзіць у сталоўкі разам з астатнімі. Казуліну дадому прыйшоў выканаўчы ліст з Маскоўскага суду Менску з патрабаваньнем зьявіцца ў суд і выплаціць 231 тысячу рублёў.

### Суд «ARCHE»

19 кастрычніка ў Вышэйшым гаспадарчым судзе прызначаная дата судовага працэсу **часопісу «ARCHE»** супраць Мінінфармацыі: выданьне абскарджвае трохмесячнае прыпыненьне. Суд пройдзе 3 лістапада па адрасе: Менск, вул. Валадарскага, 8.

### 13 кастрычніка

Каля прахадной мэталюргічнага заводу ў Магілёве падчас раздачы бюлетэню прафсаюзу РЭП «Экспресс-инфо» затрыманы прафсаюзны актывіст **Юры Дарашэнка**.

### 16 кастрычніка

У Баранавічах падчас Дня салідарнасьці затрымалі моладзевага актывіста **Зьмітра Палойку**, які фатаграфаваў акцыю. Міліцыянты зьбілі яго, зламалі нос і ўсю ноч пратрымалі ў пастарунку. Уранку на яго склалі пратакол за тое, што нібыта лаяўся матам, і аштрафавалі на 5 б.в.

### 18 кастрычніка

Вярхоўны суд не задаволіў скаргі **ПКБ**, якая пратэставала супраць афіцыйнага папярэджаньня ад Мін'юсту.

У Магілёве затрыманыя два непаўналетнія моладзевыя актывісты, якія малявалі графіці «Свабоду Дашкевічу!» і «Малады фронт».

### 20 кастрычніка

Бабруйскі суд адмовіўся аднавіць на працы актывіста ПБНФ, дэпутата гарсавету **Алеся Чыгіра**.

Актывісту польскай мяншыні **Войтэку Барадзіну** абмежавалі выезд за мяжу: у АВІРы яму адмовіліся паставіць пячатку ў пашпарт, спаслаўшыся на загад Навагрудзкага КДБ.

У Глыбокім актывіста ПБНФ **Яраслава Берніковіча** выклікалі ў раённую пракуратуру, каб даў тлумачэньні наконт улётак пра мясцовыя выбары, што зьявіліся ў людных месцах райцэнтру.

Ганцавіцкі суд даў вуснае папярэджаньне распаўсюдніцы недзяржаўнай газэты «Ганцавіцкі час» **Вользе Новік**, якая забылася выпісаць квіток за прададзеную газэту. Да гэтага на жанчыну, паводле яе словаў, некалькі дзён палявалі міліцыянты й падаткавікі, каб падлавіць хоць на чым-небудзь.

### 23 кастрычніка

Кіроўца гомельскага аўтапарку №1, сябра Незалежнага прафсаюзу **Сяргей Шведаў** абскарджвае ў Гомельскім абласным судзе сваё звальненьне. Яго звольнілі за тое, што нібыта правёз трох пасажыраў без квіткоў. Аднак на

пратэсту.

Але самая вялікая й розгаласная *плошча Свабоды* ў Беларусі (больш за 1500 квадратных мэтраў) цяпер знаходзіцца ў менскім мікрараёне Сухарава ў будынку Эвангельскай царквы «Новае жыцьцё». Былы калгасны кароўнік, перароблены хрысьціянамі праз рамонт у дом малітвы, які рэжым хоча адабраць і ў якім людзі мусяць трымаць галадоўку-пост, — вось сымбаль твой, забыты краю родны! І зьвярнеце ўвагу, на якой мове выраблены галоўны плякат акцыі, на якой удзельнікі галадоўкі ўсё часьцей даюць інтэрвію, на якой пачынаюць маліцца. На мове свабоды — па-беларуску.

На гэтай мове сьпяваюць музыкі-пачаткоўцы, друкуюцца значкі, саколкі ды ўлёткі, на гэтай мове гамоніць Інтэрнэт. Беларуская мова — ужо ня проста мова супраціву. Гэта мова свабоды. Мова мужнасьці. Мова веры.

Пэўна ж, калі Госпад Бог даў нам, беларусам, сваю мову — дык і зьвяртаецца Ён да нас па-беларуску.

Хто мае вушы, каб чуць — няхай чуе.

«Ня хлебам адзіным жыве чалавек...» — сьцьвярджаюць усе галадоўнікі 2006-га. «...А ўсякім словам, якое зыходзіць з вуснаў Божых», — удакладняе Эвангельле (Лукі 4:4).

Бо слова, мова — гэта тое, што найболей адрозьнівае чалавека аж жывёлы і наймацней выяўляе ў ім вобраз і падабенства Божае.

А свабода...

Свабода — найвялікшае пракляцьце для чалавека, але адначасна і найвялікшае блаславеньне. Праз свабоду выбару, вольную волю чалавецтва ўпала ў грэх — але маюць Ісуса Хрыста — і збаўляюцца. Разам са свабодай Магутны Бог даў нам права на памылку, разам з гэтым правам — магчымасьць пакаяньня. І разам з пакаяньнем — жыцьцё вечнае ў вечнай свабодзе.

Вось чаго больш, чым хлеба, прагнуць хрысьціяне з «Новага Жыцьця». Вось за што моліцца за кратамі Зьміцер Дашкевіч. Вось да чаго прыслухоўваюцца ў галасох свабоды сіценцы, віцьбічы, менчукі.

«Дзе Дух Гасподні — там Свабода!» — кажа Біблія. А дзе Дух Божы і Слова Божае — там нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

P.S.

30 кастрычніка, у Міжнародны дзень салідарнасьці з палітвязьнямі, рэжым будзе судзіць Зьмітра Дашкевіча і «Малады фронт». Усіх беларусаў, хто разумее мову Свабоды, запрашаю аб 11 гадзіне ў Дом правасудзьдзя (Сямашкі, 33) выступіць сьведкамі салідарнасьці. За нашу і вашу свабоду!

Самая вялікая *плошча Свабоды* ў Беларусі цяпер знаходзіцца ў менскім мікрараёне Сухарава.

судзе усе трое заявілі, што ня ехалі тым рэйсам.

У Жодзіне запланаваныператрус у офісе грамадзкага аб'яднаньня інвалідаў вайны ў Аўганістане: у яго кіраўніка **Аляксандра Камароўскага** падчас пераезду беларуска-польскай мяжы знайшлі ў шапцы фальшывыя 500 даляраў. Камароўскі — пастаянны аўтар газэты «Народная воля», у яго асацыяцыі працуе Павал Красоўскі.

На прэзэнтацыю фільму «Ўрокі беларускай мовы» (пра сакавіцкія падзеі ў Менску) у Беларусь не пусьцілі аўтара — польскага рэжысэра **Міраслава Дэмбінскага**: адказ наконт уязной візы беларускія ўлады паабяцалі даць толькі 25 кастрычніка.

У Мастоўскі РАУС выклікалі актывіста ПКБ **Аляксандра Пудаўкіна** ў сувязі зь яго паездкай у Малдову ў 2005 г. у складзе групы грамадзкіх актывістаў, якія ехалі назіральнікамі на прэзыдэнцкія выбары.

**АШ**

# Кацярыну Садоўскую асудзілі на 2 гады


WWW.SVABODA.ORG

Суд Ленінскага раёну Менску прызнаў Кацярыну Садоўскую вінаватай у абразе гонару і годнасьці Аляксандра Лукашэнкі. За абразу Аляксандра Лукашэнкі 60-ці гадовая пэнсіянэрка правядзе 2 гады ў папраўчай калёніі агульнага рэжыму. Паводле судовага рашэньня, Кацярына Садоўская мусіць сплаціць 4 мільёны рублёў кампэнсацыі судзьдзям Кіраўскага раённага суду (Магілёўская вобласьць).

Праваабаронцы паведамляюць, што «абразу гонару й годнасьці» знайшлі ў звароце, які жанчына напісала, але не пасьпела распаўсюдзіць. Яго сканфіскавалі падчасператрусу ў яе кватэры.

Абвінаваўцай на працэсе выступала Натальля Талаш, судзьдзёй — Тацяна Жулкоўская. Што датычыць Кіраўскага райсуду, дык менавіта яго судзьдзя Надзея Чмара ў свой час вынесла абвінаваўчы прысуд Герою Сацыялістычнай Працы Васілю Старавойтаву.

**Паводле радыё «Свабода»**

## Зьмянілі сьвет, хоць ніколі не існавалі



Што супольнага паміж мужчынам з рэклямы цыгарэтаў *Marlboro*, Гамлетам і Санта Клаўсам? Тое, што хоць яны і выдуманыя пэрсанажы, затое рэальна ўплывалі на чалавецтва — пішуць аўтары лексыкону «101 найбольш уплывовая асоба, якая ніколі не існавала», выдадзенага ў ЗША.

Аўтары склалі сьпіс пэрсанажаў, вядомых зь мітаў, літаратуры і рэклямы, якія, на іх думку, мелі найбольшы ўплыў на паводзіны людзей, а іншым разам і зьмянілі хаду гісторыі. *Marlboro Man* займае ў сьпісе першае месца: на думку аўтараў, ён паспрыяў сьмерці мільёнаў курцоў, якія памерлі ад раку лёгкіх.

Вялікі Брат з раману Джорджа Оруэла «1984» займае ў гэтым рэйтынгу другое месца, а на трэцім знаходзіцца кароль Артур, якога часам лічаць гістарычнай постацьцю.

Дзед Мароз, якога яшчэ называюць Сьвятым Мікалаем ці па-амэрыканску Санта Клаўсам, у апошнім квартале кожнага году перахоплівае ўплыў на эканоміку, за што аўтары прызналі за ім чацьвёртае месца ў сьпісе.

На далейшых месцах апынуліся Гамлет, Франкенштайн, Рамэо і Джульета, а таксама лялька Барбі, якая, на думку аўтараў, навязала нам недасяжны стандарт прыгажосьці.

**На фота**: Marlboro Man. На яго сумленьні — сьмерці мільёнаў курцоў.

**АД паводле gazeta.pl**

## Сацыёлягі: самы вялікі беларускі страх — турма

Сацыёлягі кампаній, якія ўваходзяць у групу «Эўразійскі маніторынг», зьвярнуліся з аднолькавым пытаньнем да грамадзянаў Беларусі, Расеі і Казахстану. Выявілася, што самы вялікі беларускі страх — турма. Пра гэта заявілі 23% апытаных беларусаў. У расейцаў гэты паказьнік — 13%, а ў казахаў — 7%.

Паводле сьведчаньняў беларускіх праваабаронцаў, каля 20% зьняволеных, якія знаходзяцца ў турмах Беларусі, — былыя кіраўнікі дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў.

**АК**

## Будапэшт: масавыя маніфэстацыі

Аддзелы паліцыі, ужываючы водныя гарматы і сьлезацечны газ, разагналі ў ноч з панядзелка на аўторак радыкальных праціўнікаў сацыялістычна-лібэральнага ўраду.

Да хваляваньняў дайшло ў дзень, калі Вугоршчына сьвяткавала 50-ю гадавіну антысавецкай рэвалюцыі 1956 г.

Паводле ратавальных службаў, 128 чалавек было паранена, сярод іх восем — цяжка. Затрымана каля ста асобаў.

У панядзелак на працягу дня ў Будапэшце пратэставала каля 100 000 людзей. Пасьля таго, як дэманстранты закідалі паліцыю камянямі, тая ўжыла ў адказ гумовыя кулі. Вечарам дэманстранты здолелі прывесьці ў рух танк Т-34 зь дзейнай пад адкрытым небам выставы, прысьвечанай рэвалюцыі 1956 г. Паліцыя затрымала танк.

Як паведамляюць агенцыі, уначы лік дэманстрантаў скараціўся да некалькіх соцень чалавек, якія рэпрэзэнтавалі ў асноўным крайніх правых. Толькі пад ранак на вуліцах і цэнтральным мосьце Альжбеты — месцах сутычак — быў адноўлены рух.

**АД паводле замежнай прэсы**

## Чатыры краіны ствараюць пашуковік Радзівілаў

Архівы Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы ствараюць інфармацыйна-пошукавую сыстэму па родзе Радзівілаў. Мэта праекту — узьяднаньне ў інфармацыйна-пошукавай сыстэме некалі вядомага нясьвіскага архіўнага комплексу. «Пратакол прадугледжвае на падставе міжнароднага стандарту вопісу ІСАД стварэньне адзінай аўтаматызаванай інфармацыйна-пошукавай сыстэмы», — патлумачыла Ала Галубовіч, кіраўніца Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі.

У чатырох краінах захоўваюцца граматы, дакумэнты наконт кіраваньня маёнткамі, перапіска Радзівілаў па службовых, вайсковых, асабістых пытаньнях, а таксама радаводныя кнігі, генэалягічныя табліцы, дароўныя, тэстамэнты ды іншыя дакумэнты. Яны першапачаткова захоўваліся ў нясьвіскім архіве, створаным у 1551 годзе адным з князёў магнацкага роду.

**Паводле bybanner.com**

## Ліцэй у Лодзі без тэорыі Дарвіна

У адным зь ліцэяў польскага гораду Лодзь вырашылі ўстрымацца ад вывешваньня ў кабінэце біялёгіі табліцы з дарвінаўскай схемай эвалюцыі чалавека. Гэта адбылося пасьля выказваньня намесьніка міністра адукацыі Польшчы Міраслава Ажахоўскага, які мае тэалягічную адукацыю. Ён назваў тэорыю эвалюцыі «хлусьнёй», «узаконенай памылкай» і сказаў, што адчувае сябе «нашчадкам чалавека, а ня малпы». Ажахоўскі цалкам падтрымлівае рашэньне ліцэю, бо «дарвінізм — гэта толькі адна з тэорыяў, а табліца б даводзіла вучням ейную выключнасьць».

Польскія навукоўцы цяпер пратэстуюць.

**АД паводле замежнай прэсы**

## З таксафонаў цяпер можна званіць за кошт абанэнта

Паслуга называецца «Зручны званок з таксафона». Для таго, каб пагаварыць за чужы кошт, не патрэбная нават тэлефонная картка. Дастаткова проста набраць з таксафона код «8-11» і паведаміць апэратару «Белтэлекаму» тэлефонны нумар таго, з кім патрэбна пагаварыць. Паслуга дзейнічае толькі для нумароў фіксаваных тэлефонаў, затое па ўсёй краіне. На нумар мабільнага тэлефона і за мяжу такім чынам патэлефанаваць ня ўдасца.

Тады апэратар сам тэлефануе абанэнту і пытаецца, ці згодны ён плаціць за ўваходны званок. Калі згодны, адбываецца злучэньне. Скарыстацца з новай паслугі можна ў любым месцы краіны, дзе ёсьць таксафон «Агат» з вадкакрышталічным экранам.

Кошт хвіліны размовы — 150 руб.

**Паводле «Белтэлекам»**



GAZETA WYBORCZA

**Дэманстранты здолелі прывесьці ў рух танк Т-34 зь дзейнай пад адкрытым небам выставы, прысьвечанай рэвалюцыі 1956 г.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У цэнтры Парыжу такога ня ўбачыш. На фота: жыхары квітнеючай мяхамі цягнуць танную капусту з восеньскіх кірмашоў.**

# Віленскі прыбой

Гэтымі днямі беларуская мова на гулкіх віленскіх вуліцах — ня дзіва. Беларускае студэнцтва распачало чарговы навучальны год у Вільні. Тузін студэнтаў сёлета абрала сабе аддзяленьне беларусістыкі ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсітэце. Разам з будучымі беларусістамі другога курсу яны складаюць ладную суполку. Агулам у ЭГУ сёлета распачало ці працягнула сваё навучаньне больш за 1 500 чалавек.

А Катэдра беларускай філялёгіі факультэта славістыкі Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсітэту сёлета адзначае 15-годзьдзе! І ёсьць на што азірнуцца. Сёлета на завочную бакаляўрскую праграму сюды паступіла 100 чалавек зь Беларусі. А на стацыянар набралі дзясятак студэнтаў, сярод якіх ёсьць і будучы беларусіст зь... Нігерыі!

Згадваючца радкі з Уладзімера Жылкі: «Але ўжо лёс рукой няўхільнаю Загад вызначвае зь вякоў: Усё магутней б»е пад Вільняю Прыбой нямоўкнучы з палёў...».

Нагадаем, студэнтам беларускай філялёгіі Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсітэту застаецца й Зьміцер Дашкевіч, якога ў ягонай alma mater шануюць і чакаюць.

**СХ, Вільня**

## Спэцапэрацыя ў лясах пад Менскам




«НАВІНКІ»

«Навінкі» здымаюць новую стужку.

У ноч з 14 на 15 кастрычніка ў лясах пад Менскам прайшла спэцапэрацыя з удзелам людзей у міліцэйскай форме й крапавых бэрэтах. Рэй вялі маладыя людзі з арт-групы «Навінкі», якія праславіліся аднайменнай газэтай ды фільмамі «Гуд-бай, бацька» і «Случай з пацаном».

Згодна са сцэнаром новага фільму жахаў «Толькі мёртвыя нічога не баяцца», на лясной прагаліне папавыкопваліся зомбі. Сама атака пачвараў адбылася год таму, а сёлета да месца здарэньня дабраліся «сілавікі».

Сярод спэцназаўцаў былі Паўлюк Канавальчык, Шырлі і другія афіцыйныя асобы анархісцкага гурту.

Прэм'ера зомбі-карціны прызначаная на сьнежань.

Зомбі ўжо адзьнятыя.

Сілавікі таксама.

На паляне загрызьлі ўсіх...

**Андрэй Расінскі**

## Гімн ААН пераклаў Барадулін

61 год таму, 24 кастрычніка 1945 г., набыў сілу Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў. У гэты дзень адзначаецца Дзень ААН. Сярод краінаў-заснавальніцаў ААН была таксама Беларусь.

ААН мае ў Беларусі прадстаўніцтвы пятнаццаці падразьдзяленьняў. Сярод іх Праграма разьвіцьця ААН, Сусьветны банк. Ад мінулага году па-беларуску зьвіўся гімн ААН. Яго пераклаў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.

**Паводле радыё «Свабода»**

## У чэмпіянаце па зьяданьні сала беларус саступіў украінцам

У Луцку (Валынь, Украіна) прайшоў чэмпіянат «Зь любоўю да сала». Чэмпіянат адбыўся пры ўдзеле Акадэміі аграрных навук Украіны, прадстаўнікоў «Кнігі рэкордаў Гінэса».

На чэмпіянат прыехаў і адзіны прадстаўнік Беларусі — адвакат з Кобрына Сяргей Магонаў. «Таксама быў парад прыгажосьці сьвіней. Былі прэзэнтаваныя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Ўкраіны», — кажа ён.

Беларус, на жаль, ня стаў пераможцам спаборніцтва ў зьяданьні сала. «Выйграў спадар з Луцку. Пастаўленая была задача зьесьці кілаграм сала за 20 хвілін. Праўда, з хлебам, з цыбуляй, часнаком і вадой. І ён «умяў» гэтае сала. А я крыху не дацягнуў, зьеў толькі палову...» От жа, беларускі адвакат застаўся пры думцы, што наша беларускае сала нават лепшае, чым украінскае.

**Паводле Радыё Свабода**

# «Урокі беларускай мовы» цяпер і ў Менску

23 кастрычніка адбылася папярэдняя (для СМІ) прэзэнтацыя фільму польскага рэжысэра Міраслава Дэмбінскага «Ўрокі беларускай мовы. Моладзь супраць Лукашэнкі». Прэзэнтацыя для шырокай грамады адбудзецца празь некалькі тыдняў.

Фільм польскага рэжысэра прысьвечаны падзеям у Беларусі падчас апошняй прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі. Як гаворыцца ў відэазвароце, запісаным самім рэжысэрам, галоўны герой стужкі — беларуская моладзь, якая была асноўным рухавіком вясновых акцыяў пратэсту. У фільме расказваецца пра жыцьцё вучняў Гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа. Аповед вядзецца ад імя Франка Вячоркі, былога ліцэіста. Такая пэрсанафікацыя, на думку рэжысэра, дазваляе лепш зразумець астатнюю беларускую моладзь, што актыўна ўдзельнічае ў палітычным жыцьці.

М.Дэмбінскі вядомы эўрапейскім гледачам стужкай пра Памаранчавую рэвалюцыю ва Ўкраіне. Сакавіцкія падзеі ён здымаў па частках: на Дзень Волі трапілі толькі два супрацоўнікі здымачнай групы, рэжысэра не прапусьцілі празь мяжу, і яму давялося кіраваць здымкамі праз Інтэрнэт.

Неўзабаве фільм будзе паказаны ў Варшаве, Ляйпцыгу, Амстэрдаме, Маскве. Стужку ўжо закупілі тэлеканалы Польшчы, Нямеччыны, Эстоніі, Латвіі, Літвы.

**Сямён Печанко**


ІГАР КРАШЭЎСКІ

Аляксей Янукевіч прэзэнтуе фільм.



## Сьвята паэзіі на радзіме Сыса

**«Дух – гэта, людзі, Я!..»** — пад такім назовам **28 кастрычніка** ў Гарошкаве адбудзецца першае сьвята паэзіі ў гонар Дня народзінаў паэта Анатоля Сыса. У імпрэзе бяруць удзел родныя і сябры паэта, а таксама: Ларыса Раманава, Эдуард Акулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дранько-Майсюк, Андрэй Мельнікаў, Барыс Пятровіч, Міхась Скобла, Іван Штэйнер, Віктар Ярац і іншыя беларускія паэты і барды. Запрашаюцца ўсе, каму дарагія беларуская Паэзія і Песьня.

Пачатак імпрэзы а 14-й гадзіне ў засьпенскім Доме культуры (Рэчыцкі раён). Праезд аўтобусамі: Менск—Рэчыца, Рэчыца—Гарошкаў.

### КАЛЯНДАР

## Лістапад

75 гадоў з пачатку выданьня газэты Міністэрства ўнутраных справаў Беларусі «На страже» (1931).

**2** — Дзяды.

**2** — 100 гадоў з дня нараджэньня заслужанага доктара Беларусі, доктара-гігіеніста Зьмітра Бяляцкага (1906—1982).

**4** — 100 гадоў з дня нараджэньня народнай артысткі Беларусі, балерыны Аляксандры Нікалевай (1906—1997).

**8** — 50 гадоў з часу адкрыцьця Музэю абароны Берасьцейскай крэпасьці (1956).

**13** — 200 гадоў з дня нараджэньня героіні вызваленчага паўстаньня 1830—1831 гадоў графіні Эміліі Плятэр (1806—1831).

**14** — 125 гадоў з дня нараджэньня кліматоляга і геафізыка, акадэміка Аляксея Кайгарадава (1881—1951).

**18** — 75 гадоў з дня нараджэньня паэта Анатоля Вярцінскага (1931).

**18** — 75 гадоў з дня нараджэньня скульптара Генадзя Мурамцава (1931).

**19** — 125 гадоў з дня нараджэньня хірурга Ўладзімера Марзона, заслужанага доктара Беларусі (1881—1954).

**23 — 100 гадоў з дня выхаду першага нумару «Нашай Нівы» (1906).**

**27** — Дзень Герояў (Дзень Слуцкага збройнага чыну 1920 году).

**28** — 125 гадоў з дня нараджэньня геоляга Аляксандра Розіна, чальца-карэспандэнта Акадэміі навук Беларусі (1881—1942).

# Культурны выбух: выйшаў збор твораў гісторыка Туронка

Віленскі Інстытут беларусістыкі выдаў новую кнігу знанага гісторыка Юр’я Туронка «Мадэрная гісторыя Беларусі». У гэтым дыхтоўным зборы — дзевяць соцень старонак, аўтарская прадмова, пяць разьдзелаў, камэнтары і паўсотні рэдкіх ілюстрацыяў. Выйшла кніга вялікім фарматам, накладам 1000 асобнікаў.

«Выданьне ўнікальнае, яно ня мае аналягаў у сучаснай беларускай гістарыяграфіі — кажа галоўны рэдактар часопісу «ARCHE» Валерка Булгакаў, які ўклаў і зрэдагаваў грубезны том. — Возьмем разьдзел «Вайна і акупацыя», які займае трацiну кнігі. Туронак карыстаўся найкаштоўнейшымі крыніцамі, сярод якіх Александрыйскія мікрафільмы. Гэта сакрэтныя дакумэнты фашыстоўскай Германіі, захопленыя амэрыканцамі і скапіяваныя на мікрафільмы. Па вайне палова гэтага архіву трапіла да польскіх гісторыкаў. Аўтар грунтуецца выключна на дакумэнтах, а не на вусных сьведчаньнях, успамінах ці савецкай прапагандзе. Дагэтуль, напрыклад, шырокаму колу беларусаў невядомы факт таго, што ў нямецкай адміністрацыі на тэрыторыі акупаванай Беларусі існавала моцнае супраціўленьне тактыцы вынішчэньня акупаванай тэрыторыі.

Кніга названая «Мадэрная гісторыя


АРЦЁМ ЛЯВА

Беларусі» зь дзьвюх прычынаў: папершае, бальшыня артыкулаў у ёй хранаягічна прысьвечаная падзеям эпохі мадэрнасьці. Па-другое, гісторыя Беларусі ў гэтай працы разглядаецца з пазыцыі мадэрнасьці, працы Туронка мэтадалягічна вельмі сучасныя.

Кніга гэтая — кампэндыюм ведаў, прызначаны для шырокага кола чытачоў. Асабліва раю яе замежнікам, што трапляюць да нас ня проста адпачыць — бо тут можна адшукаць адказы на найбольш часта задаваныя пытаньні: калі была ўтвораная першая палітычная партыя, выдадзеная першая газэта і г.д.

Аўтар меў доступ да такіх крыніцаў, якія савецкім адмыслоўцам нават ня сьніліся. Таму ня дзіўнымі выглядаюць спасылкі на ягоную «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» у кнізе Якава Трашчанка».

Зь апошняй большасьць студэнтаў і мае шанец дазнаецца пра патрыярха беларускай гістарыяграфіі. Бо сёньня, як і да канца 80-х гадоў, спадзявацца на тое, што кніга трапіць ва ўнівэрсытэцкія бібліятэкі, ня варта. Увесь наклад мае разысьціся праз прыватных распаўсюднікаў.

Варта адзначыць, што кніга найбуйнейшага беларускага гісторыка — першае выданьне, падрыхтаванае віленскім Інстытутам беларусістыкі.

Незвычайнай грунтоўнасьці выданьне несумненна станецца падзеяй на кніжным рынку і доказам таго, што беларуская інтэлектуальная думка разьвіваецца. Робіцца традыцыяй, што цэлыя зборы твораў прафэсійна рыхтуюцца незалежнымі творчымі калектывамі, ня скутымі «ідэалягічным» кантролем.

**Сямён Печанко**

# Беларусь вачыма біёграфа Івана Жахлівага

Выйшаў з друку новы том «Беларускага гістарычнага агляду».



Беларускі гістарычны агляд. Т.12.

Гвозд гэтага нумару — мэмуары лютэранскага пастара Паўля Адэрборна, які ў часе Лівонскае вайны знаходзіўся на Полаччыне разам зь нямецкімі наёмнікамі-жаўнерамі. Дагэтуль Адэрборн быў вядомы большасьці гісторыкаў як аўтар біяграфіі маскоўскага цара Івана Жахлівага, а яго «Праўдзівы і грунтоўны аповед пра веру русаў, шлюбныя і пахавальныя абрады, побыт, адзеньне і г.д., а таксама пра веру і звычаі татараў» заставаўся ў цені. Больш за тое — ён стаў аб’ектам гістарычнае памылкі. У пазьнейшых нямецкіх рэдакцыях героі лацінічнага аповеду пра жыцьцё Падзьвіньня, «русы», ператварыліся ў «маскавітаў». «БГА» друкуе тэкст у першасным выглядзе. Беларусь XVI стагодзьдзя паўстае напаўпаганскім барбарскім краем, прытулкам сьмелых ваяўнічых людзей.

Сярод іншых цікавостак новага «БГА» — артыкул гісторыка Алеся Пашкевіча аб выбарах у Віленскі сойм у 1922 г., за часоў «Сярэдняй Літвы». Тэкст сьведчыць, што пытаньне «браць ці ня браць» удзел у несправядлівых выбарах паўставала перад беларусамі задоўга да 2001 г. Праблема тая дыскутавалася ў тагачаснай «Нашай Ніве», адноўленай Антонам Луцкевічам у 1920-я. Аўтар падае цытаты адтуль.

Чарговы беларуска-швэдзкі эксклюзіў ад Андрэя Катлярчука — тэкст пра апошнюю швэдзкую вайсковую апэрацыю ў ВКЛ: аблогу Берасьця ў 1657 г. У дадатку — рэдкія тагачасныя пляны места.

Украінская дасьледчыца Наталья Юсава адсочвае этапы ўвядзеньня ў гістарычную тэрміналёгію каляніяльнага панятку «старажытнаруская народнасьць».

У разьдзеле «Новая літаратура» — 18 рэцэнзіяў на беларускія, украінскія, польскія, нямецкія, расейскія выданьні, што сваёй тэматыкай кранаюць Беларусь.

**ЯК**



# Ці здох воўк?

Кіроўныя вярхі не настолькі прыціснутыя абставінамі, каб сур'ёзна саступаць Захаду. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Афіцыйны Менск робіць жэсты. Аддалі летувісам самалёт-парушальнік (зь лета думалі). Памякчэлі ў пытаньні пра будаўніцтва ля нашае мяжы сховішча радыяактыўных адыходаў Ігналіны. Паставілі кропку ў порнаскандале з латвійскім дыпляматам. Нарэшце, сьпікер Канаплёў сустрэўся з кіраўніком ПАРЭ ван дэр Ліндэнам, а ўрадавая дэлегацыя правяла ў штаб-кватэры Міжнароднай арганізацыі працы кансультацыі наконт пасляблення ўціску для незалежных прафсаюзаў.

Аналітыкі загаварылі пра пэрспэктывы дыялёгу з Захадам. Маўляў, Крэмль прыціснуў так, што даводзіцца пакрысе напаўняць рэальным зьместам лёзунг пра шматвэктарнасьць. На думку Яраслава Раманчука, 2007 год увогуле можа стаць пераломным. Экспэрт лічыць, што «рэзкі рост цэнаў на энэрганосьбіты змусіць афіцыйны Менск іначай зірнуць на сваё месца на мапе Эўропы».

Але казаць, што воўк на гары здох, прынамсі рана. Пакуль што пераважаюць жэсты і абяцанкі. Пра імкненьне да сур'ёзнага дыялёгу не выпадае казаць хаця б таму, што не спыняецца рэпрэсіўны канвэер. Толькі што далі два гады праваабаронцы Кацярыне Садоўскай, вось-вось пачнецца закрыты працэс над Зьмітром Дашкевічам.

Зрэшты, і Захад не сьпяшаецца ціснуць. Пад маркай перамоў Менску зь Міжнароднай арганізацыяй працы пытаньне аб санкцыях Эўразьвязу фактычна спусьцілі на тармазах.

Палітоляг Уладзімер Роўда лічыць, што пэўныя эўрапейскія структуры і дзеячы цалкам гатовыя будаваць стасункі зь Беларусьсю ў духу так званай *Realpolitik*. Маўляў, пугай абуха не пераб'еш, дык мо заплюшчым вочы на тое-сёе... Бо ў мностве практычных пытаньняў (гандаль, транзыт, нелегалы і г.д.) дзейную уладу не аб'едзеш.

Яна ж, са свайго боку, нібы і ня супраць трохі ўлагодзіць дачыненьні. Ну, каму прыемна пачувацца неўязным ці страчваць грошы праз санкцыі? Дый эканамічная дывэрсыфікацыя не зашкодзіць. Разам з тым, на думку Ўладзімера Роўды, рэжым элемэнтарна баіцца прывязвацца да Захаду. Нездарма так адбіваліся ад усіх гэтых Сорасаў ды МВФаў! Страх дэмакратызацыі, дакладней яе наступстваў, перарос у фобію. А дэманстрацыйнымі заляцаньнямі да Брусэлю можна хіба паказытаць нэрвы Маскве.

Палітоляг Валер Карбалевіч таксама дапускае, што калі пашэнціць дамагчыся ад Крамля кампрамісных коштаў на газ, гульня ў пацяпленьне стасункаў з Эўразьвязам спыніцца. Хаця ня выключана, што беларуская ўлада адчуе «смак незалежнасьці ад Масквы».

Дарэчы, у апазыцыйных штабах, здаецца, устрывожыліся, што Лукашэнка адбярэ прыярытэт у кантактах з Захадам, выцісьне ўнутраных апанэнтаў з гэтае дзялянкі. Гэтаксама, як раней пазбавіў манаполіі на незалежніцкую рыторыку.

Шэраг экспэртаў раяць апазыцыйным лідэрам не мітусіцца. Сёньня ў кіроўных вярхоў не такая крытычная сытуацыя, каб ісьці на прынцыповыя саступкі. Таму, не адкідаючы спробаў дыялёгу, варта засьцерагацца ўцягваньня ў фарс. Напрыклад, пад маркай якога-небудзь круглага стала.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У панядзелак атрымаў ад рэдактара наступнае «мыла»: «каровы–ўцякачкі — Вам тэма на гэты тыдзень».
Мяркую, яго прачыталі і кампэтэнтныя органы. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

# Спэцапэрацыя «каровы»



Па факце перахопленага чэкістамі электроннага ліста ў Чырвоным доме сабраўся сынэдрыён самых высокіх саноўнікаў.

— Ёсьць апэратыўная інфармацыя, што «НН» зьбіраецца запусьціць мульку наконт тых кароў-перабежчыц, — пачаў бы нараду Ністатэнебыл (скарот ад: ніякага сталінскага тэрору не было) Эдмундавіч.

— Гэта сур'ёзная правакацыя, — рэагуе дырэктар МЗС сп.Шматвектарны, — атрымліваецца, што нават траваедныя бягуць ад рэформы вёскі. Што ўжо казаць аб гомасапіенсах.

— Спакуха, ня ўсё страчана, — у размову ўступае сп.Падпрапагандысцкі, — «Наша Ніва» выходзіць у пятніцу, і ў Саўбелцы за чацьвер мы пасьпеем давесьці, што ўсе жартачкі гэтага... Ушкіна — абсалютная праўда. Такім чынам, галоўнае апазыцыйнае выданьне стане дэ факта нашым рупарам.

Усе прысутныя: «супэр, клясна, ваў!!!»

Падпрапагандысцкі працягвае:

— Трэба простым аналітычным шляхам вылічыць, з чаго можа сьцябацца гэны, як там яго, Пушкін. Я кажу вам, спадар Беларусь-сягоньняшні, хопіць зырыць у акно на фанатак «N.R.M.», якія тусуюцца на месцы палатачнага мястэчка.

— Прабачце. Якія будуць вэрсіі?

Хвіліна маўчаньня, падчас якой чуваць, як у суседнім пакоі нехта гундосным голасам енчыць у тэлефон:

— Калі «Віцязь» ня выйдзе на рынак Габону, я зь цябе асабіста тэлепузіка зраблю, зразумеў?..

Пры апошніх словах усе здрыгануліся.

— Ну, натуральна, апазыцыя можа прыкалоцца з таго, што пастух быў сябром «Маладога фронту» і наўмысна пагнаў статак за кардон, — пачынае прэм'ер Узрост Вэвэпоўскі.

— О'кэй, — прафэсійна рэагуе сп.Беларусь-сягоньняшні. — Мы выйдзем з артыкулам пад загалоўкам «Воўк у каровінай скуры» аб тым, што той калгасьнік быў ня проста сябрам Севярынца, але яшчэ і кляпаў антыбацькаўскія мульты на сваім сайце.

— А мы на яго пачэпім выбухі ў Віцебску і ўсе сэксуальныя вычварэньні апошніх гадоў гэтак за пяць. Пакуль каровы пасьвіліся, ён мог спакойна і з тым жа латышом пазажыгаць, — кажа Ністатэнебыл Эдмундавіч.

Падпрапагандысцкі:

— Яны, напэўна, будуць намагацца правесьці паралель паміж Вікай Мароз і каровамі. І яе, і тых гвалтоўна павярнулі на радзіму.

— О'кэй. Другі матэрыял на паласе — «Польскі бык хацеў насуперак міжнароднаму праву пакінуць усіх непаўналетніх беларускіх цялушак сабе, аднак наша дыпляматыя сказала сваё важкае слова».

— Відавочна, пройдуцца па патэнцыі нашых быкоў.

— Не пытаньне: будзе інтэрвію з польскім дэпутатам, сябрам Самаабароны, які, наведаўшы Беларусь, быў уражаны памерамі... нашых быкоў.

На гэтым паседжаньне заканчваецца.

Ягоныя ўдзельнікі ня ведаюць, што прэм'ер, якому сьвеціць адстаўка за сытуацыю на тытунёвым рынку, ужо рыхтуе сябе ў новыя Казуліны.

Таму сакрэтна працуе з апазыцыяй і, натуральна, зьліў «адмарозкам» усю стэнаграму нарады.

У пятніцу фэльетаніст «НН» пасьцябаўся з таго, што нелегальны пераход кароваў быў адмысловай апэрацыяй выведнікаў. Выведка адпрацоўвала тактыку, як разьвіць айчынную жывёлагадоўлю за кошт замежных бугаёў-вытворцаў.



**Пратэстанты з царквы «Новае жыцьцё» працягваюць галадоўку. Старонка 4. На фота: у суботу 21 кастрычніка адбыўся мітынг салідарнасьці з галадоўнікамі.**

## Бог ненавідзіць беззаконьне...

**Хачу падзяліцца з вамі сваім стаўленьнем да акцыі галадоўка-пост царквы «Новае жыцьцё».**

Як напісаў В.Карбалевіч, «галадоўка — гэта акцыя адчаю, скрайняя форма барацьбы...». Веру альбо нявер'е паказала нам царква «Новае жыцьцё»? Асабіста мне яны паказалі сваё нявер'е ў Бога, зьвярнуўшыся да акцыі адчаю. Яны спадзяюцца, што ўлада, убачыўшы рэзананс у грамадзтве дзеля доўгай галадоўкі, пакіне ім будынак. У іх дзеяньнях я бачу дысцыпліну, арганізаванасьць, згуртаванасьць і сілу волі ў адстойваньні сваіх інтарэсаў. Але дзе сапраўдная вера ў Боскую дапамогу? Напэўна, не дачакаўшыся адказу ад Бога, яны вырашылі ўзяць справу ў свае рукі. 21 кастрычніка на мітынгу пратэсту царква «Новае жыцьцё» паказала нечаданьне асацыяваць сябе з апазыцыяй, яны прасілі здымаць значкі «За свабоду». Людзі, якія прыйшлі са значкамі, сыходзілі зь мітынгу. Цікава, а калі б прыйшлі сябры БРСМ са сваімі значкамі, што б зрабіла царква «Новае жыцьцё»?

Бог любіць праўду і ненавідзіць беззаконьне, і ён не саромеецца асацыяваць сябе з тымі, хто за праўду. Маладыя людзі, якія носяць значкі «За свабоду», хочуць свабоды і справядлівасьці ў сваёй краіне, гэта супадае з жаданьнямі Бога.

Шкада, што царква «Новае жыцьцё» не паказала сапраўднай веры. Людзі з сапраўднай верай бачаць і рэагуюць на беззаконьні, якія робяцца ў сваёй нацыі, а ня толькі скіраваныя супраць інтарэсаў іх царквы.

**Хрысьціянка-эвангелістка Ірына Гоманава, Менск**

## Стражаў студэнтам на сьмех,

**Або комплекс адкрылі, гардэроб — забыліся.**

Дворык БДУ. На інфармацыйным стэндзе — новы нумар газэты «Беларускі ўнівэрсытэт». На адной з палос выданьня — фота рэктара Васіля Стражава. На фота прафэсар Стражаў разам з намесьнікам міністра адукацыі Жуком прымае ў эксплюатацыю вучэбна-спартовы комплекс «Унівэрсытэцкі» на вул.Кастрычніцкай. Такая падзея! Хаця комплекс насамрэч быў вельмі патрэбны студэнтам БДУ. Быў? Не, ён і цяпер патрэбны, бо да эксплюатацыі ВСК «Унівэрсытэцкі» так і не дайшло. Высьветлілася, што рэканструкцыя комплексу, якая доўжылася пяць гадоў, так і не завершаная. Высьветлілася, але гэта не перашкодзіла замаўчаць факт і зладзіць чарговы спэктакль. А наколькі рэканструкцыю будынку не дарабілі? Невядома. Хаця з таго, што студэнтаў не пускаюць у гардэроб комплексу нават пераапранущца (гэта даводзіцца рабіць на вуліцы), можна меркаваць, уся праца яшчэ наперадзе.

**СМ, Менск**

## Гарун імчаў хутчэй аленя

**Сыходзячы з таго, як заўзята зьнішчаецца ў Беларусі ўсё беларускае і найперш мова, можна сказаць, што абаронцам мовы й культуры прыходзіцца весьці сапраўдную нацыянальна-вызвольную вайну.**

Ня мае значэньня, што акупант у нас свой па крыві. Нічога не мяняе, што вайна гэта халодная, а не гарачая.

На вайне свае прыярытэты і свая мараль. Тут галоўны прыярытэт — гэта Радзіма. Усё астатняе — каханьне, адукацыя, кар'ера, сям'я і г.д. — адсоўваецца на заднія пляны. Гэта зразумела, бо без сваёй культуры ўсё развальвацца і сыплецца, гніе і сьмярдзіць. Вось як пісаў аб прыярытэце Радзімы М.Лермантаў (і падобных твораў безьліч у паэзіі і літаратуры) у вершы «Уцякач»:

Гарун бежал быстрее лани,
Быстрей, чем заяц от орла.
Бежал он в страхе с поля брани,
Где кровь черкесская текла.

Пакінуўшы поле бітвы, Гарун прыбег да сябра Сэліма, які канаў ад ранаў, але той пракляў яго, калі даведаўся аб дэзэртырстве Гаруна. Гарун накіраваўся ў аул, дзе жыла ягоная каханая, але пачуў песьню каханай аб юнаку-джыгіту, які змагаецца за веру пpapoкa. Не наважыўся паказацца ёй на вочы. Нарэшце ён у адчаі кінуўся да маці, але і тая пракляла яго — «ты раб и трус и мне не сын».

А што мы бачым у Беларусі? У нас сотні маладзёнаў бягуць з поля бітвы, зь Беларусі, толькі дзеля таго, што іх выдалілі з навучальных установаў і іх адукацыя часова прыпынілася! Выходзіць, што адукацыя для іх важнейшая за Радзіму. А яны ж трэба Беларусі цяпер! Зразумела, што большасьць зь іх пакідаюць Беларусь назаўсёды, бо ўлада абвесьціць іхныя замежныя дыплёмы несапраўднымі...

**Павал Біч, Менск**

# ГУМАР

## Канюшына

**Чаму яе ніколі ня дораць вэртыкальшчыкам на сьвятах?**

Выяву цяперашняга герба Беларусі прапанаваў на рэфэрэндуме 1995 г. сам А.Р. На ім ёсьць выява канюшыны. Раз яна на гербе, дык можна меркаваць, што яна вельмі падабаецца, а мо і ўлюбёная кветка насельніцтва Беларусі. Аб гэтым сьведчаць афіцыйныя лічбы аб выніках рэфэрэндуму. Але апытайце колькі заўгодна чалавек пра іхнюю ўлюбёную кветку — ніхто яе і ня ўспомніць. Яшчэ ведама, што канюшыну як страву найболей падабаюць коні, таму наш народ яе і назваў — канюшына. Але ж коней на рэфэрэндуме не апытвалі... У чым жа справа? Агульнавядома, што А.Р. вельмі чулы да грамадзкай думкі, а тут такі аблом. У апошняе ня верыцца, тут нешта іншае. Хацелася б паразважаць аб прычынах зьяўленьня гэтай кветкі на нашым гербе, але мне здаецца, што, карыстаючыся беларускай мовай, я, як і А.Р., ня здолею выказаць разумнай здагадкі. Таму хай ён прабачыць мяне за беларускамоўныя меркаваньні.

На мой погляд, выява канюшыны на гербе зьявілася ад любові А.Р. да коней. Але адразу ж можна пярэчыць гэтай думцы — не магло падсьвядомае адолець сапраўднае каханьне А.Р. да хакейнай клюшкі. І калі працягнуць меркаваньні далей, то на нашым гербе былі б апошнія, але ж гэтага ня здарылася.

Працягваючы здагадкі аб матывах, якімі кіраваўся А.Р. пры разьмяшчэньні канюшыны на сваім гербе, можна прыйсьці і да таго, што яе выява падкрэсьлівае пераемнасьць беларускай дзяржаўнасьці. На старадаўнім нацыянальным гербе і на зьмененым на рэфэрэндуме была выява каня, але без канюшыны. А які ж конь можа доўга вытрымаць без канюшыны? Вось А.Р. і задаволіў яго, і супакоіў «перажывавшае» за галоднага каня грамадзтва. А сувязь конь—канюшына на старых і новым гербе проста кідаецца ў вочы, і яе ня бачаць толькі неразумныя людзі. Мяркую, калі б наша апазыцыя, што пад кіраўніцтвам З.С. ад перамогі да перамогі, прапанавала новы герб дзяржавы, зьмясьціла на ім перад канём і канюшыну, то А.Р. ніколі б не адважыўся б на рэфэрэндум дзеля зьмены нацыянальнай сымболікі. Электарат бы ня «понял».

Ёсьць і яшчэ адзін матыў, якім мог кіравацца А.Р. Канюшына — гэта сымбаль талерантнасьці насельніцтва Беларусі. Ёю з герба падкрэсьліваецца для ўсяго сьвету: вось, глядзіце, якія мы «пафігісты», нам усё роўна, і мы можам нават канюшыну «праглынуць», калі нам загадае начальнік.

Мае разважаньні пра шаноўную кветку перапыніла пытаньне. Чаму яе разам са сьцяблінкамі ільну ніколі ня дораць пры нагодзе на сьвятах і ўрачыстасьцях таму ж А.Р. і ягоным вэртыкальшчыкам? Лічу гэта вялікай хібай у ідэалягічным выхаваньні нашага насельніцтва.

Хацелася б пачуць і меркаваньні наконт гэтага ідэолягаў нашай дзяржавы.

**Хведар Пінчук, Менск**

# ERRATA

## Фядута — Садоўскаму

У мінулым нумары «НН» надрукавалі эсэ сп.Садоўскага, у якім ён закрануў маральнае аблічча вялікага расейскага паэта Мікалая Някрасава, прыпісаўшы яму аўтарства даволі вядомага вершу «Бокал заздравный поднимая...».

Сьпяшаюся ўзнавіць гістарычную справядлівасьць. Як я ўжо казаў у інтэрвію радыё «Свабода», гэтага вершу М.Някрасаў ніколі не пісаў. Яго былі апублікавалі пад крыптанімам Н.А.Н., за якім хаваўся чыноўнік канцылярыі Віленскага генэрал-губэрнатара М.А.Нікоцін. Верш уяўляе сабою тост, сказаны ў прысутнасьці групы саслужыўцаў у гонар графа М.Мураўёва-Віленскага. А сам сп.Нікоцін і распавёў аб гэтай гісторыі ў сваіх цыдулках, апублікаваных 1890 г. Яны цяпер перахоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Затым я спадзяюся, што сп.Садоўскі прыме да ведама сваю памылку і болей ня будзе паклёпнічаць на сумленных людзей.

З павагай,

**кандыдат філялягічных навук, начальнік упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь (25.07.1994—05.01.1995) Аляксандар Фядута**

# Буш прычынай высокіх цэнаў на нафту?

Гутарка з палітолягам **Дзянісам Мельянцовым** пра сучасную Амэрыку і ўплыў яе замежнай палітыкі на сытуацыю ў Беларусі.

**«Наша Ніва»: Пачнём з таго, што выясьнім, чым усё ж ёсьць Амэрыка сёньня?**

**Дзяніс Мельянцоў:** Гэта недзе банальная фраза, але ЗША — гэта адзіная звышдзяржава ў сьвеце, якая засталася пасьля распаду Савецкага Саюзу, таму на Амэрыку ўскладаецца шмат адказнасьці. Падчас халоднай вайны ЗША адыгрывалі ролю своеасаблівага флягмана дэмакратыі, на які арыентаваліся дэмакратычныя альбо тыя, якія хацелі б стаць дэмакратычнымі, краіны. Пасьля падзеньня жалезнае заслоны краіны былога сацлягеру таксама сталі арыентавацца на Амэрыку. Зь іншага боку, сытуацыя, калі Злучаныя Штаты засталіся адзінай звышдзяржавай, цягне за сабой актывізацыю іхнай замежнай палітыкі, што ставіць адной са сваіх мэтаў перафарматаваньне міжнароднай сыстэмы, зыходзячы з амэрыканскіх стандартаў. У сыстэме, дзе адсутнічае балянс сілаў, Амэрыка часта дзейнічае па-за міжнароднымі рэжымамі і шматбаковымі працэдурамі.

Гэткія дзеяньні выклікаюць шмат прэтэнзіяў. Адсюль і такая зьява, як антыамэрыканізм і часткова антыглябалізм, бо глябалізацыя праходзіць таксама збольшага паводле амэрыканскіх стандартаў.

## Амэрыка карыстаецца несумненным даверам з боку апазыцыі

**«НН»: Што ж тады такое ЗША для Беларусі?**

**ДзМ:** Тут залежыць ад таго, што маем наўвеце пад тэрмінам Беларусь. Калі мы гаворым пра афіцыйны Менск, дык ЗША ўяўляюцца як гегемон, які спрабуе падпарадкаваць сабе незалежныя і свабодалюбівыя дзяржавы. ЗША, такім чынам, становяцца вобразам ворага, які мусіць кансалідаваць беларускае грамадзтва. Такі вораг карысны, калі ўладзе трэба на кагось сьпісаць свае абмылкі ва ўнутранай палітыцы, патлумачыць абмежаваньне правоў і свабодаў і г.д.



**Дзяніс Мельянцоў**

магістар гуманітарных навук у галіне міжнародных стасункаў, асьпірант катэдры міжнародных адносінаў БДУ.

Юлія Дарашкевіч

Калі мы гаворым пра незалежнае грамадзтва, дык, натуральна, Злучаныя Штаты застаюцца ўзорам пабудовы дэмакратычнай дзяржавы. Такім узорам таксама магла б выглядаць Эўропа, аднак трэба памятаць, што ЗША, у адрозьненьне ад Эўропы, заўжды праводзілі больш жорсткую і пасьлядоўную палітыку што да падтрымкі апазыцыі і ніколі не спрабавалі ісьці на саступкі беларускім уладам, якія маглі б нашкодзіць дэмакратычнаму грамадзтву. Таму Амэрыка карыстаецца несумненным даверам з боку апазыцыі.

## Антыамэрыканізм падаграюць лідэры традыцыйных грамадзтваў

**«НН»: Зьява антыамэрыканізму, якая шырыцца ў сьвеце, што гэта такое? Чаму нават сярод беларускае дэмакратычнае грамады існуюць пачаткі гэтай зьявы? Ці антыамэрыканізм ахапіў усе пласты беларускага насельніцтва?**

**ДзМ:** Калі ў шырокім кантэксьце браць на разгляд такую зьяву, як антыамэрыканізм, то яна карэніцца ў сучаснай канфігурацыі сыстэмы міжнародных дачыненьняў — адзіная звышдзяржава — і ў выкліках глябалізацыі. Аднапалярнасьць вядзе да пашырэньня ўплыву ЗША на сусьветныя працэсы і прысутнасьці амэрыканскіх інтарэсаў паўсюль на плянэце. Натуральна, што гэта выклікае процідзеяньне з боку традыцыйных грамадзтваў, лідэры якіх страчваюць сваю ўладу ў новых умовах. А з другога боку — такія дзеяньні не задавальняюць іншыя цэнтры сілы, такія як Кітай ці Эўрапейскі Зьвяз.

Нягледзячы на тое, што Эўропа і ЗША разьвіваюцца ў межах адной цывілізацыі і падзяляюць адзіныя каштоўнасьці, у іх зусім розны погляд на сьвет і спосабы правядзеньня замежнай палітыкі. Маецца на ўвазе супрацьпастаўленьне унілятэралізму (аднабаковасьці) ЗША і мультылятэралізму (шматбаковасьці) ЭЗ.

Што датычыць Беларусі, то беларускі антыамэрыканізм складаецца з канфлікту каштоўнасьцяў, зайздрасьці і рэліктаў сьвядомасьці часу халоднай вайны. Ён культывуецца як інструмэнт кансалідацыі грамадзтва ва ўмовах дэкляраванага варожага атачэньня.

Што да антыамэрыканізму ў дэмакратычным асяродку, дык ён узьнікае, магчыма, дзеля наяўнасьці ў розных палітычных суб’ектаў розных арыенціраў.

**Працяг на старонцы 20.**

# Буш прычынай высокіх цэнаў на нафту?

Працяг са старонкі 19.

Пэўныя колы апазыцыі арыентаваныя на Амэрыку, іншыя — на Эўропу, у якой тыя ж каштоўнасьці, але другія шляхі іх рэалізацыі, таму, напрыклад, сацыяльная палітыка эўрапейскіх краінаў больш прывабная, скажам, для нашых сацыял-дэмакратаў, чым палітыка адміністрацыі Буша. Але тут мы кажам пра антыамэрыканізм іншага кшталту чым той, які прапагандуе БТ і іншыя дзяржаўныя СМІ.

### ЗША ня мае ў Беларусі жыцьцёвых інтарэсаў

**«НН»: Ці быў у Амэрыкі калі-небудзь рэальны шанец неяк істотна паўплываць на гісторыю Беларусі?**

**ДзМ:** Калі мець на ўвазе наўпроставы ўплыў, дык тут вельмі цяжка аб нечым гаварыць, бо ЗША мае небагаты інструмэнтар уплыву на беларускую палітыку. Калі мы ўвогуле гаворым пра вонкавы ўплыў на Беларусь другой краіны, то тут можна прыгадаць толькі Расею, але таксама з агаворкамі. І ў другой палове 90-х, і на пачатку новага стагодзьдзя Штаты распачыналі некалькі палітычных дэмаршаў што да Беларусі (прыгадаем хаця б «Акт аб дэмакратыі ў Беларусі»), але яны не далі плёну. Відаць, гэта праз тое, што ЗША ня мае ў Беларусі жыцьцёва важных інтарэсаў. Калі б яны меліся, дык і палітыка Белага дому адносна Беларусі была б больш мэтанакіраваная і, галоўнае, эфэктыўная. Яны не гатовыя пакуль цалкам уцягвацца ў вырашэньне беларускага пытаньня.

**«НН»: Калісьці гучалі меркаваньні, што праз амэрыканскія бамбёжкі Югаславіі захлынулася антылукашэнкаўская кампанія 1999 году...**

**ДзМ:** У 1999 г. напярэдадні косаўскай вайсковай кампаніі беларускія ўлады самі вельмі добра папрацавалі, каб ня даць адбыцца альтэрнатыўным выбарам: былі праведзеныя кадравыя перастаноўкі ва ўрадзе, перарэгістрацыя арганізацыяў і г.д. Косаўская кампанія толькі паспрыяла таму, што ўвага міжнароднай грамадзкасьці была адцягнутая ад Беларусі. У гэтых умовах улады здолелі хутка і без залішняга розгаласу распраўіцца са сваімі палітычнымі апанэнтамі.

### Я ня бачу наўпроставай залежнасьці паміж адміністрацыяй Буша і цэнамі на нафту

**«НН»: Многія палітолягі лічаць, што завоблачныя цэны на нафту апошнія гады зьвязаныя з пэрсонай Буша-малодшага, які нібыта адлюстроўвае інтарэсы нафтавага лобі. На высокіх цэнах на нафту ў многім і трымаецца беларускі эканамічны цуд.**

**ДзМ:** Я ня бачу наўпроставай залежнасьці паміж адміністрацыяй Буша і цэнамі на нафту. Цэны на нафту залежаць у першую чаргу ад палітычнай стабільнасьці нафтаносных рэгіёнаў і бесьперапынных яе паставак. Любыя вайсковыя дзеяньні на Блізкім ці Сярэднім Усходзе аўтаматычна вядуць да ўзрастаньня цэнаў на энэрганосьбіты.

**«НН»: О'кей. Але нехта ж прымаў рашэньне пра пачатак вайны ў Іраку?**

**ДзМ:** Ня варта спрашчаць матывацыі амэрыканскай адміністрацыі. Мяркую, што высокая цана нафты захаваецца, пакуль ЗША ня здолеюць канчаткова стабілізаваць сытуацыю ў Іраку і забясьпечыць тым самым бесьперашкодныя пастаўкі нафты.

### Беларуская дыяспара ў ЗША традыцыйна падтрымлівае Рэспубліканскую партыю

**«НН»: Беларуская дыяспара ў ЗША традыцыйна падтрымлівае Рэспубліканскую партыю на выбарах. Ці адпавядае гэта нацыянальным інтарэсам Беларусі на сёньняшнім этапе?**

**ДзМ:** Я, па шчырасьці, ня веру, што падтрымка ці непадтрымка дыяспарай рэспубліканскай адміністрацыі нейкім чынам адбіваецца на палітычнай сытуацыі ў Беларусі ці на падтрымцы апазыцыі з боку насельніцтва. Пераважная большасьць беларусаў наўпрост ня ведае пра існаваньне згуртаванай беларускай дыяспары і тым больш не цікавіцца ейнымі палітычнымі прыхільнасьцямі. Таму ўплыў на грамадзкую думку фактару падтрымкі або непадтрымкі кагосьці беларускай дыяспарай ня варта перабольшваць.

### ЗША застаюцца прыцягальнымі для маладых дэмакратыяў

**«НН»: Ці мусіць Беларусь існаваць, як той казаў, «у фарватэры амэрыканскай палітыкі» пасьля дэмакратычных пераўтварэньняў у нашай краіне?**

**ДзМ:** Гэта пытаньне арыенціраў тых палітыкаў, якія прыйдуць да ўлады ў Беларусі. Злучаныя Штаты на сёньня застаюцца адзінай супэрдзяржавай з дэмакратычным ладам кіраваньня. Таму яны застаюцца прыцягальнымі для маладых дэмакратыяў, такіх, як дзяржавы Ўсходняй Эўропы. Аднак актыўная замежная палітыка ЗША, якая імкнецца выйсьці па-за межы міжнародных рэжымаў і шматбаковых працэдур (ААН, АБСЭ, нават НАТО), выклікае шматлікія пытаньні. Да таго ж існуюць іншыя прыклады пасьпяховага разьвіцьця ў межах дэмакратычных інстытутаў. Я маю на ўвазе Эўропу, якая паступова ператвараецца ў сур'ёзную палітычную сілу. Яна бліжэйшая да нас і геаграфічна, і гістарычна, і культурна. Мабыць, на яе варта арыентавацца.

**«НН»: Ці можа бліжэйшым часам нехта перахапіць сусьветную гегемонію Штатаў?**

**ДзМ:** У найбліжэйшай пэрспэктыве (да дзесяцігодзьдзя) гэта практычна немагчыма. На пяты ЗША наступае Кітай, які мае вялізны патэнцыял, найперш людзкі, які будзе пашырацца. Цяпер Кітай пакуль што ня ставіць перад сабой экспансійных мэтаў, ён будзе нарошчваць сваю эканамічную магутнасьць. Пасьля таго як Кітай зьдзейсьніць комплексную мадэрнізацыю, ён пачне актыўна канкураваць са Злучанымі Штатамі і ў іншых сфэрах. У эканамічным пляне наймагутнейшым канкурэнтам ЗША цяпер ёсьць Эўрапейскі Зьвяз.

**«НН»: Дык а чаму Амэрыка можа страціць гэтае сусьветнае лідэрства?**

**ДзМ:** Гэта можа быць сытуацыя, калі Амэрыка загразьне ў вайсковых канфліктах. Яны могуць сур'ёзна падарваць яе моц.

Войны могуць папросту надакучыць амэрыканскаму грамадзтву, і наступная адміністрацыя будзе вымушана праводзіць палітыку ізаляцыянізму і займацца вырашэньнем сваіх уласных праблемаў.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Наам Хомскі: Мусаліні, Сталін, Буш

Кажуць, што тэрарызм — зброя слабых, аднак гэта хлусьня. Гэта перадусім зброя моцных. Свой уласны тэрарызм Амэрыка называе барацьбой з тэрарызмам, — кажа амэрыканскі дысыдэнт нумар 1.

**— Вы лічыце Злучаныя Штаты «галоўнай тэрарыстычнай дзяржавай». Гэта гучыць досыць недарэчна. Ці не маглі б Вы нейкім чынам абгрунтаваць Вашую думку?**

**Наам Хомскі:** Злучаныя Штаты — адзіная краіна, што адхіляе пастановы Міжнароднага суду ААН. Некалі яны рабілі гэта разам з Энвэрам Ходжам і Муамарам Кадафі, аднак цяпер Альбанія і Лібія ўжо прызнаюць пастановы суду, а ЗША па-ранейшаму знаходзяцца ў вялікадзяржаўнай ізаляцыі.

ЗША ў 80-х вялі тэрарыстычную вайну супраць Нікарагуа, якую суд асудзіў. Суд абвінаваціў тады ЗША ў «незаконным ужываньні сілы» — ці акурат у міжнародным тэрарызьме — і запатрабаваў ад ЗША ўстрымацца ад злачынстваў і заплаціць вялізарныя рэпарацыі. Рашэньне было падмацаванае дзьвюма рэзалюцыямі Рады Бясьпекі ААН — ЗША на абедзьве наклалі вэта.

А вайна ЗША супраць Кубы? Яна пачалася неўзабаве пасьля таго, як да ўлады прыйшоў Кастра, у часе кіраваньня прэзыдэнта Эйзэнгаўэра, а падчас прэзыдэнцтва Кенэдзі вялася зь яшчэ большай інтэнсіўнасьцю. Кенэдзі арганізаваў апэрацыю «Мангуста», адназначна тэрарыстычную. Кіраваў гэтай апэрацыяй брат прэзыдэнта Робэрт, генэральны пракурор ЗША. У рамках «Мангусты» агенты ЦРУ ўзрывалі нафтахімічныя прадпрыемствы, патаплялі рыбацкія судны, падкладалі бомбы ў гатэлі — падчас замахаў загінулі сотні людзей.

Гэтая вайна суправаджалася таксама і эканамічнай атакай, сплянаванай такім чынам, каб закраналася насельніцтва, бо гэта ж кубінцы несьлі адказнасьць за тое, што мелі такі, а ня іншы ўрад. Гэта таксама тэрарызм. Гэтая эканамічная вайна доўжыцца да сёньня.

Дарэчы, ЗША, калі карыстацца выразам зь лексыкону Буша, «даюць прытулак» тэрарыстам. Нагадаю, што, паводле гэтай дактрыны, дзяржавы, што даюць прытулак тэрарыстам, самі тэрарыстычныя.

**— Якім жа тэрарыстам ЗША даюць прытулак?**

**НХ:** Людзям, якіх ФБР і Дэпартамэнт юстыцыі прызналі «буйнымі міжнароднымі тэрарыстамі». Адзін зь іх — гэта Арлянда Бош, якога ФБР абвінавачвала ў трыццаці тэрарыстычных замахах — таксама і на тэрыторыі ЗША, а Дэпартамэнт юстыцыі назваў яго чалавекам, які пагражае бясьпецы ЗША і патрабаваў яго дэпартацыі. (Бош, між іншым, ажыцьцявіў замах на пасажырскі самалёт кубінскіх авіяліній у 1976 г., падчас якога загінулі 73 чалавекі.) Прэзыдэнт Буш-старэйшы дараваў яму, і Бош цяпер шчасьліва жыве ў Флорыдзе.

Іншы тэрарыст, якога ахоўваюць ЗША, — гэта Люіс Пасада Карылес, кампаньён Боша ў замаху на пасажырскі самалёт. Ён адбываў прысуд у Вэнэсуэле — гэта над ейнай тэрыторыяй узарвалі кубінскі самалёт,— аднак дзівосным чынам зьбег з турмы. Знайшоў прытулак у Сальвадоры на вайсковай базе, адкуль разам з палкоўнікам Олівэрам Нортам (постаць нумар 1 у скандале «Іран-Контрас» у 80-я) пастаўляў зброю для тэрарыстычных апэрацыяў «контрас» у Нікарагуа.

Возьмем яшчэ адзін выпадак: Гаіці, дзе на пачатку 90-х шалеў тэрор. Галоўным ягоным сейбітам быў Эмануэль Канстан, правадыр ваенізаваных груп, што супрацоўнічалі з ЦРУ. Калі да ўлады зноў вярнуўся Жан-Бэртран Арыстыд (скінуты раней падчас дзяржаўнага перавароту), Канстан зьбег у ЗША і спакойна жыве ў Куїнз, у Нью-Ёрку. Гаіці неаднаразова прасілі ягонай экстрадыцыі, аднак ЗША проста ігнаравалі ўсялякія просьбы.

Паводле дактрыны Буша, за прытулак тэрарыстам ЗША мусяць быць закіданыя бомбамі і на іх мусіць быць учынены напад.

**— Але на Кубе і ў Нікарагуа панаваў камуністычны рэжым. Шмат хто з тых, хто мае досьвед камунізму, палічыў бы гэта за неабходны мэтад барацьбы зь ім.**

**НХ:** Але ж ЗША не пачалі барацьбы з Кубай таму, што там была дыктатура! Сёньня нам ужо знаёмыя дакумэнты таго часу, і мы ведаем, што ЗША пачалі барацьбу з прычыны — як гэта акрэсьлілі адміністрацыі Кенэдзі і Джонсана — «пасьпяховага непадпарадкаваньня» Кастра палітыцы ЗША. Асьцерагаліся — гэта чорным па белым напісана ў дакумэнтах, — што пасьпяховае разьвіцьцё Кубы магло б мець уплыў на ўвесь рэгіён.

У Нікарагуа не было камунізму, а найбольш важным аб'ектам атакі ЗША і там, і па ўсёй Цэнтральнай Амэрыцы быў Каталіцкі Касьцёл. Справа дайшла да масавых забойстваў, эскадроны сьмерці, што карысталіся падтрымкай ЗША, застрэлілі, напрыклад, архібіскупа Сан-Сальвадора Оскара Рамэра.

**— У Польшчы таксама забілі вядомага ксяндза, які выступаў супраць улады...**

**НХ:** І ягоных забойцаў тут жа схапілі і пакаралі. А ў Сальвадоры не вялося нават сьледзтва! Такое доўжылася цэлае дзесяцігодзьдзе 80-х, што скончылася забойствам шасьці сальвадорскіх езуітаў, якое ўчыніў элітарны батальён, абвучаны і ўзброены амэрыканцамі.

**— Да 1956 г. падобныя злачынствы зьдзяйсьняліся і ў камуністычных краінах.**

**НХ:** Безумоўна, час Сталіна быў жа-

**Працяг на старонцы 22.**



**Наам Хомскі** (Noam Chomsky, Наам Чомскі), нар. у 1928 г., выбітны лінгвіст, бацька якога паходзіць з Украіны, а маці — зь Беларусі. Стваральнік генэратыўнай граматыкі, прафэсар Масачусэцкага тэхналягічнага інстытуту на пэнсіі. Шмат якія левыя рухі ўважаюць яго за свайго духоўнага настаўніка.

# Наам Хомскі: Мусаліні, Сталін, Буш

Працяг са старонкі 21.

хам, аднак давайце параўнаем Усходнюю Эўропу ў пэрыяд пасьля Сталіна і краіны Лацінскай Амэрыкі, што ў той самы час знаходзіліся ў сфэры ўплыву ЗША.

Калі хтосьці пагаджаецца з усеагульнай ідэяй пра правы чалавека, то ўсё, што было зроблена людзям і грамадзтвам Лацінскай Амэрыкі, мае прынцыповае значэньне для ацэнкі палітыкі ЗША і ўвогуле для этычных стандартаў, якімі мы карыстаемся ў палітыцы. Расейцы таксама мелі свае адгаворкі, казалі, што абараняюцца ад амэрыканцаў. Таму калі нейкія палякі апраўдваюць злачынствы ЗША тым, што амэрыканцы абараняліся ад расейцаў, дык як бы тым самым кажуць: «Правы чалавека ня маюць для нас ніякага значэньня».

**— Вашае азначэньне тэрарызму даволі шырокае.**

**НХ:** У мяне няма ўласнага азначэньня тэрарызму, я карыстаюся азначэньнем, што афіцыйна прызнаецца ўрадамі ЗША і Вялікай Брытаніі. Згодна з гэтым азначэньнем, тэрарызм — гэта «наўмыснае ўжываньне сілы альбо пагроза ўжываньня сілы дзеля дасягненьня палітычных, рэлігійных ці ідэалягічных мэтаў шляхам запалохваньня альбо ўціску». У сваю чаргу брытанскі ўрад называе тэрарызмам «дзеяньне ці пагрозу дзеяньня, агрэсіўнага і шкоднага, якое мае на мэце аказаньне ўплыву на ўрад, запалохваньне грамадзтва, а таксама падтрымку якога-небудзь палітычнага, рэлігійнага ці ідэалягічнага праекту». Таму Злучаныя Штаты і Вялікая Брытанія — галоўныя тэрарыстычныя дзяржавы ў сьвятле тых вызначэньняў, што прызнаюцца ўладамі абедзьвюх краін. Дактрына Буша, дзе ідзе гаворка пра дзяржавы, што даюць прытулак тэрарыстам, робіць гэтае вызначэньне яшчэ больш шырокім.

Кажуць, што тэрарызм — зброя слабых, аднак гэта ідэалягічная хлусьня. Гэта перадусім зброя моцных. А свой уласны тэрарызм ЗША называюць барацьбой з тэрарызмам.

**— Вы называеце тэрарызмам таксама і такія дзеяньні, як эканамічныя санкцыі. Думаеце, яны не бываюць правамоцныя? Калі ў 80-я гады Роналд Рэйган абвесьціў санкцыі супраць камуністычнага ўраду ў Польшчы, дык шмат хто з палякаў падтрымліваў іх, бо спадзяваўся, што гэта паскорыць занепад камунізму.**

**НХ:** Часам санкцыі могуць адпавядаць крытэрам тэрарыстычнага дзеяньня. Адным з галоўных крытэраў ёсьць тое, ці насельніцтва краіны, супраць якой абвяшчаюцца санкцыі, пагаджаецца зь імі; калі так — ведаем, што часам насельніцтва адкрыта пра іх просіць — санкцыі яшчэ як правамоцныя. Добрым прыкладам тут будзе ПАР у час апартэіду. Цемнаскуры люд — каля 80 адсоткаў усяго насельніцтва — цярпеў ад санкцыяў, але пра іх прасіў.

**— Чаму Вы крытыкавалі санкцыі супраць Іраку ў 90-я гады?**

**НХ:** Бо гэта было злачынствам. Санкцыі забілі сотні тысячаў людзей і, на мой погляд, зрабілі немагчымым скіданьне Садама. Іракцы б яго выгналі дакладна гэтак жа, як былі выгнаныя Сухарта ў Інданэзіі, Маркас на Філіпінах і іншыя, параўнальныя зь ім, якіх ЗША падтрымлівалі да канца.

Паўтараю: існуюць правамоцныя і неправамоцныя санкцыі. Найбольш доўга цягнуцца санкцыі супраць Кубы — насуперак волі кубінцаў, не зважаючы на пратэсты міжнародных арганізацыяў. Галасаваньні ў ААН паказваюць, што пераважная большасьць ня згодная з гэтымі санкцыямі. Вынік апошняга галасаваньня колькі месяцаў таму: 178 галасоў супраць, 4 — за. Акрамя ЗША, іх падтрымаў Ізраіль, галасаваньне якога ў ААН сьведчыць пра каляніяльны характар гэтай дзяржавы, а таксама Гаіці і Палаў.

**— Ці сытуацыя з правам на гуманітарную ўзброеную інтэрвэнцыю падобная да сытуацыі з эканамічнымі санкцыямі?**

**НХ:** Ёсьць такое вядомае выказваньне, якое прыпісваецца Гандзі: калі яго спыталі, што ён думае пра заходнюю цывілізацыю, ён адказаў: «Гэта была цудоўная ідэя». Я адкажу гэтак жа: гуманітарная інтэрвэнцыя была б цудоўнай ідэяй. Зірнем на гісторыю ХХ ст. Да Другой сусьветнай вайны былі тры выпадкі «гуманітарнай інтэрвэнцыі»: уварваньне Мусаліні ў Этыёпію, перахоп Судэтаў Гітлерам, а таксама напад Японіі на Маньчжурыю. Я іранізую — гэта, вядома, не былі гуманітарныя інтэрвэнцыі, хаця іх падавалі гэтак. Гітлер абяцаў, што скончыць этнічны канфлікт у Чэхаславакіі, а нябогам-чэхаславакам гарантуе доступ да нямецкіх здабыткаў цывілізацыі. Кожная ваенная інтэрвэнцыя падаецца яе аўтарамі як гуманітарная, нават тыя, што зьдзяйсьняюцца найгоршымі монстрамі. Няйнакш было і са злачыннай інтэрвэнцыяй СССР у Вугоршчыне ў 1956 г., якую савецкія юрысты апраўдвалі просьбай вугорскага ўраду і абаронай ад «узброеных бандаў». Гэтак сама было з амэрыканскай інтэрвэнцыяй у Віетнаме, якая апраўдвалася «калектыўнай самаабаронай» і «ўнутранай агрэсіяй».

**— Хіба ніколі не было інтэрвэнцыяў, якія б ратавалі жыцьцё вялікай колькасьці людзей?**

**НХ:** Пасьля Другой сусьветнай вайны мне вядомыя толькі два выпадкі такіх інтэрвэнцыяў. Першы — гэта напад Індыі на Ўсходні Пакістан у 1971 г. Падобна да таго, што ён уратаваў мільёны жыцьцяў. Другім была інтэрвэнцыя Віетнаму ў Камбоджу ў 1978 г., якая паклала канец пал-потаўскім забойствам. Гэтыя выпадкі, аднак, не сустракаюцца ў дыскусіях пра гуманітарную інтэрвэнцыю.

**— Чаму?**

**НХ:** Бо іх зьдзейсьнілі «ня тыя» людзі, і ЗША заўзята выступілі супраць абедзьвюх інтэрвэнцыяў.

У 1971 г. Пакістан, які вынішчаў бунтоўнае насельніцтва (сёньняшняя тэрыторыя Бангладэш), быў хаўрусьнікам ЗША.

У выпадку інтэрвэнцыі ў Камбоджу ЗША і Вялікая Брытанія тут жа пасьпяшаліся з падтрымкай Пол Пота, у ААН настойвалі, каб скінутыя ў выніку віетнамскай інтэрвэнцыі «Чырвоныя кхмеры» захавалі сваё прадстаўніцтва ў арганізацыі (бо былі антысавецкія)...

**— Ці адпавядала крытэрам гуманітарнай інтэрвэнцыі апэрацыя ў Косаве?**

**НХ:** Да найбольшых злачынстваў у Косаве дайшло ў выніку бамбёжак NATO! Зьвярнеце ўвагу, што закіды супраць Мілошавіча спачатку абмяжоўваліся злачынствамі ў Косаве, якія адбыліся пасьля інтэрвэнцыі NATO. Найболей злачынстваў у той час зьдзейсьніла партызанская Армія вызваленьня Косава, што выклікала помсту сэрбаў і злачынствы супраць жыхароў Косава.

Калі ёсьць жаданьне зразумець, што думала адміністрацыя Клінтана датычна Косава, варта зазірнуць у кніжку Джона Норыса з прадмовай Строуба Тэлбата, галоўнага дарадцы прэзыдэнта ў балканскіх справах. Дык вось, Норыс




піша, што падчас прыняцьця рашэньня пра бамбардаваньні Сэрбіі ў 1999 г. гуманітарны бок ня меў ніякага значэньня. Тэлбат напісаў пра гэта адкрыта: гаворка ішла пра тое, што Сэрбія не праводзіць належных сацыяльных і палітычных рэформаў. Хтосьці, хто дапускае «пасьпяховае непадпарадкаваньне», мусіць быць пакараны. Абарона жыхароў Косава была надуманай прычынай. Гэта цынізм.

**— Таму Вы лічыце, што амэрыканскія правадыры, якія спасылаюцца на гуманітарную інтэрвэнцыю, — гэта проста цынікі і крывадушнікі, а ідэалістычная рыторыка, «місіянэрства» Амэрыкі — маскіроўка для эканамічных інтарэсаў? Можа, аднак, некаторымі кіруе ідэалізм, сапраўдная вера ў распаўсюд дэмакратыі?**

**НХ:** Калі мы хочам паводзіць сябе як свабодныя людзі, дык да заяваў правадыроў трэба ставіцца крытычна.

Усе вялікія правадыры ў гісторыі абвяшчалі місіянэрскія мэты. Мусаліні казаў, што ён мае за мэту далучэньне барбарскіх этыёпаў да цывілізацыі; ён жадаў далучыць іх да заходняй цывілізацыі. Сталін таксама казаў, што абараняе нацыянальныя меншасьці і змагаецца з фашызмам. У французаў была «цывілізацыйная місія» ў Альжыры...

У Амэрыцы ўсё тое самае, забудзьцеся на амэрыканскую выключнасьць. Кожная моцная дзяржава заўжды была «выключнай» адным і тым жа чынам. Ніводзін чалавек, калі ён пры сваім розуме, не ўспрымае сур'ёзна заяваў палітычных кіраўнікоў. Можа быць, Гітлер верыў, што нясе Чэхаславаччыне мір. Але якое значэньне мае тое, у што ён верыў?

**— Вы параўноўваеце Буша з Гітлерам і Сталіным?**

**НХ:** Не, я толькі сьвядома называю іх прозьвішчы, бо гэта найвялікшыя пачвары ў гісторыі, і я хачу паказаць, што абвяшчэньні намераў гэтак жа ня маюць значэньня ў выпадку Гітлера, Сталіна, як і ў выпадку кожнага кіраўніка дзяржавы. Трэба ўбачыць, што ідзе за заявамі. Нядаўна выйшла кніжка гісторыка Томаса Карозэрза. Карозэрз піша пра шчырую адданасьць Амэрыкі справе распаўсюджваньня дэмакратыі і разам з тым зьвяртае ўвагу на тое, што кожны ўрад ЗША знаходзіцца ў шызафрэнічнай сытуацыі: Амэрыка падтрымлівае дэмакратыю тады і толькі тады, калі гэта спрыяе яе стратэгічным і эканамічным інтарэсам.

Маўчаньне карэйцаў з Поўначы можна апраўдаць, бо яны жывуць пры дыктатуры. Аднак калі заходнія інтэлектуалы паводзяць сябе як паўночныя карэйцы — апраўданьняў няма. Гэта добраахвотнае падпарадкаваньне ўладзе.

Калі нехта кажа пра дэмакратычную місію Амэрыкі, няма нічога прасьцейшага, як паехаць у краіны-пратэжэ: Калюмбію, Сальвадор, Гватэмалу. У Калюмбіі забіваюць больш прафсаюзных дзеячаў, чым ва ўсіх іншых краінах сьвету, разам узятых, і гэтая краіна сёньня — асноўны адрасат ваеннай дапамогі ЗША.

**— Я б хацеў яшчэ запытацца пра спадчыну замахаў 11 верасьня, асабліва пра страх. У якой ступені ён вызначае цяперашняе становішча амэрыканцаў і палітыку ЗША?**

**НХ:** Але 11 верасьня было чымсьці рэальным. Гэта, відаць, быў найбольш бязьлітасны тэрарыстычны замах у гісторыі. Тэрыторыя ЗША была атакаваная ўпершыню пасьля 1814 г. Таму ў нас ёсьць усе падставы, каб баяцца. Пасьля 11 верасьня я думаў, што надыдзе сэрыя атак. Амэрыка атакавала іншыя краіны, тэрарызавала іхнае насельніцтва, а тут раптам кола гісторыі павярнулася проці нас. Гэта выклікала шок і жах. Амэрыканская выведка прыйшла да высновы, што атака атамнай «бруднай бомбай», хутчэй за ўсё, непазьбежная ў бліжэйшую дэкаду. Я падзяляю гэтыя страхі.

На жаль, адміністрацыя Буша дзейнічае такім чынам, што робіць гэтую пагрозу яшчэ больш рэальнай. Ці сапраўды яны не разумелі таго, што, нападаючы на Ірак, павялічваюць пагрозу?

Аднак ёсьць яшчэ адзін вынік замахаў 11 верасьня: адкрыцьцё чалавечых розумаў, што робіць больш адкрытым грамадзтва. Раней большасьць амэрыканцаў ня мела ніякага ўяўленьня пра вонкавы сьвет. Пасьля 11 верасьня шмат каго пачало цікавіць, што адбываецца ў сьвеце. Выдаўцы масава пачалі перавыдаваць малатыражныя крытычныя кніжкі з пачатку 80-х, і яны цяпер выдатна прадаюцца. Ніколі не было гэтулькі запрашэньняў, канфэрэнцыяў, лекцыяў, тысячаў людзей, што прыходзяць на сустрэчы па ўсёй Амэрыцы... Гэта напаўняе аптымізмам і выклікае надзеі на аднаўленьне дэмакратыі.

*Пераклала Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl, скарочана. Поўны варыянт можна прачытаць на сайце nn.by/*

# Ці ёсьць альтэрнатыва

Так, гэта хаос, — мяркуе амэрыканскі палітоляг **Ўолтэр Расэл Мід**.

## Хто сказаў, што Амэрыкі ня любяць

**— Чаму ЗША нагэтулькі непапулярныя ў сьвеце?**

— Чаму непапулярныя? Гэтак думаюць эўрапейцы. Між тым на сьвеце ёсьць месцы, дзе ЗША нашмат больш папулярныя, чым пяць альбо дзесяць гадоў таму. Нават у Кітаі вобраз Амэрыкі палепшаў. Дзесяць год таму шмат хто з кітайскай эліты баяўся, што Амэрыка хоча застопарыць разьвіцьцё Кітаю. Цяпер ужо няшмат хто так лічыць. У Японіі наш вобраз там палепшаў таксама. У XXI ст. цэнтар сьвету перасунецца ў кірунку Азіі. А там, прынамсі ў найважнейшых краінах, стаўленьне да ЗША лепшае.

Безумоўна, ёсьць рэгіёны, дзе сымпатыя да ЗША меншае. Гэта Эўропа, арабскі сьвет, Лацінская Амэрыка. Прычыны гэтага розныя.

**— Бадай, галоўнае — гэта вайна ў Іраку.**

— Большасьці арабаў, суністаў, адпавядаў Ірак Садама, бо ён быў суніцкі. Сёньня яны пераkананыя: дзеяньні ў Іраку — спроба ЗША падзяліць арабскі сьвет. Яны не ўспрымаюць візіі ЗША, што іракцы могуць самі сабой кіраваць і будаваць дэмакратыю.

**— Ці можа Амэрыка штосьці зрабіць, каб выправіць фатальны імідж?**

— Па-першае, стабілізаваць Ірак. Калі гэтаму дамо рады, мусім падтрымаць праект «Арабія»! Толькі зьменены. Падтрымаць тыя сілы, якія мяркуюць, што прататыпам Арабіі мае быць не нацыяналістычная Нямеччына, але Эўропа. Арабам неабходная не цэнтралізаваная дзяржава, якой кіруе нейкі Бісмарк, але аб'яднаньне на прынцыпах, падобных да Эўразьвязу.

Стабілізацыя Іраку, дзе існуе некаторая згода курдаў, шыітаў і сунітаў, яшчэ магчлівая. Але яна дакладна парушыцца, калі мы сёньня адступім.

Я ня веру, што ўдасца зь яго стварыць арабскую Швайцарыю. І пісаў, што мы павінны дзякаваць Богу, калі зь яго выйдзе малодшая, брыдчэйшая сястра Турэччыны.

**— Вайна ў Іраку — не адзіная прычына зьніжэньня папулярнасьці ЗША.**

— Для лацінаамэрыканцаў галоўную ролю іграе крах іх надзеяў 90-х, надзеяў, што яны хутка дагоняць разьвіты сьвет. У гэтым расчараваньні яны абвінавачваюць ЗША.

Сьвет перажывае фундамэнтальныя сацыяльныя і эканамічныя зьмены. Мы адыходзім ад традыцыйнага капіталізму XX ст. у фордаўскім стылі: калі ты атрымаў працу на заводзе Форда, дык меў яе ўсё жыцьцё, твае дзеці хадзілі ў нядрэнныя садкі і школы, лепшала ахова здароўя. Усім гэтым апекавалася дзяржава, ахоўваючы ўласны рынак ад канкурэнцыі замежных тавараў і таннейшай працоўнай сілы. Такі капіталізм дамінаваў у Заходняй Эўропе дзесяцігодзьдзі. Цяпер перад эўрапейцамі адкрываецца — на іх думку небясьпечная — канкурэнцыя. Шмат хто мяркуе, што новую, больш драпежную форму капіталізму прыносіць з сабой Амэрыка.

**— Выходзіць, рэгіёны сьвету, якім выгадная глябалізацыя, любяць ЗША, а тыя, што ў глябалізацыі не знаходзяць сябе, Амэрыку ненавідзяць?**

— Выходзіць таксама, што, калі людзям нешта ў сьвеце не падабаецца, яны лічаць, што за гэта адказнасьць нясе галоўная дзяржава, ЗША. Гэта мне нагадвае змоўніцкія тэорыі пра габрэяў. Мае суразмоўцы ў розных частках сьвету лічаць, што габрэйскае лобі кіруе палітыкай ЗША... Тады я пытаюся: «Вы маеце на ўвазе Джорджа Сораса?» «Так, так!» — «І Пола Вулфавіца?» — «Так, так!» Суразмоўцаў не цікавіць, што гэтыя ўплывовыя людзі маюць адваротныя погляды.

**— Але ж Штаты і сапраўды маюць сёньня найбольшы ўплыў на лёсы сьвету.**

— Безумоўна. Але гэта не азначае, што зьбіраецца ўрад ЗША і вырашае: замест фордаўскага капіталізму трэба ўвесьці міленіюмны. Проста амэрыканская эканоміка зьмяняецца, а за гэтымі зьменамі сьпяшаюцца іншыя. Калі вялікая фірма з ЗША прыходзіць да высновы, што зьменшыць выдаткі, калі перанясе частку вытворчасьці ў Кітай, фірмы зь Нямеччыны мусяць зрабіць тое самае.

## Трымацца правілаў, а не правакаваць

**— З аднаго боку, Вы кажаце, што сьвет не зьмяняюць рашэньні ўраду ЗША, але зь іншага — прапануеце, каб Амэрыка ўплывала на кшталт новага сьвету, кшталт міленіюмнага капіталізму.**

— Мы ня можам кантраляваць увесь сьвет, але можам старацца зрабіць нешта, каб ён быў лепшы. Калі мы зірнём на гісторыю краінаў, якія зь нястачы ўзьняліся да дабрабыту, мы заўважым, што галоўным у іх пераменах быў доступ звычайных людзей да грошай, што зьмянялі іх жыцьцё. Гаворка ідзе пра разьвіцьцё спажывецкага крэдыту і інстытуту іпатэкі. Гэта здарылася ў ЗША на зломе XIX і XX ст. Просты прынцып, што кошт 30-гадовага іпатэчнага крэдыту на будаўніцтва дому роўны кошту арэнды дому, а значыць выгадней будаваць уласны, чым браць у арэнду, зьмяніў Амэрыку.

**— Дык што ж пайшло ня так?**

— Калі параўноўваць фінансавую сыстэму з сыстэмай водаправоду, можна сказаць, што ў той час паклалі толькі самыя буйныя руры. Але чалавек, які хоча заснаваць фірму ці збудаваць дом, не падключыць кран да трубы дыямэтрам у адзін мэтар. Забыліся стварыць структуры, што б дзялілі велізарныя сумы на невялікія крэдыты для маленькіх людзей.Наіўна думалі, што ўлады асобных краінаў зробяць гэта самі. А ўлады тым часам раскрадалі крэдыты.

**— Але ў многіх краінах, напрыклад, арабскіх, ЗША падтрымліваюць карумпаваныя эліты!**

— Амэрыка павінна нада-



**Ўолтэр Расэл Мід** — экспэрт Рады міжнародных дачыненьняў у Нью-Ёрку, адзін з самых выбітных аналітыкаў замежнай палітыкі ЗША, друкуецца ва ўсіх найбуйнейшых амэрыканскіх газэтах, а таксама штомесячніку *Foreign Affairs*. Найбольш вядомая яго кніга — *Special Providence: American Foreign Policy and How it Changed the World* («Спэцыяльнае прызначэньне: амэрыканская замежная палітыка, і як яна зьмяніла сьвет»). Неўзабаве мае выдаць кніжку *God on Our Side?* («Ці Бог на нашым баку?»).

# дамінацыіі ЗША?

ваць значэньне таму, як рэагаваць на рэвалюцыйныя рухі ў бедных краінах, якімі кіруюць зладзейскія, хаця часам прыязныя нам эліты. Ці падтрымліваць такія рухі? А што, калі яны скончацца рэжымамі, як Кастра на Кубе ці Чавэса ў Вэнэсуэле? Як рэагаваць, калі на зьмену старым, бяздарным элітам прыходзяць новыя, такія ж благія і карумпаваныя, толькі больш бязьлітасныя?

Так ці інакш, памылкі ЗША дзесяцігадавой даўніны трэба выправіць: пабудаваць тонкія трубачкі крэдытаў, даступных для звычайных людзей.




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Ўолтэр Расэл Мід: альтэрнатывай дамінаваньня ЗША можа быць толькі хаос.**

## Альтэрнатыва ЗША — хаос

**— У Штатах чуваць такія галасы: калі вы нас так ня любіце, то добра, мы ня будзем больш займацца замежжам. Тады вы ўбачыце, што сьвет без ЗША нашмат горшы.**

— Вяртаньне да ізаляцыянізму 30-х гадоў у ЗША немагчымае. Не забывайцеся, калі ласка, што нашая замежная палітыка мае свае грамадзкія вытокі. Калі Кітай пачне мацней рэпрэсаваць апазыцыю, адгукнуцца шматлікія моцныя групы і зь левага, і з правага лягеру, маўляў, трэба нешта з гэтым зрабіць. А калі Індыя зробіць больш жорсткім закон супраць навяртаньня індусаў, то нашыя баптысты з Поўдня запатрабуюць ад ураду ў Вашынгтоне жорсткай рэакцыі. Ці спыняць *IBM*, *US Steel* альбо *Google* свае інвэстыцыі ці гандаль за мяжой? А гэта ж таксама ўплывае на замежную палітыку.

**— Ці існуе ў XXI ст. нейкая альтэрнатыва кіраўніцтву ЗША ў сьвеце?**

— Можна сабе ўявіць трох кандыдатаў: Эўразьвяз, Кітай і Індыю. Аднак Эўропу падводзяць дэмаграфічныя прычыны. У сваю чаргу, Кітай і Індыя будуць хутчэй ажыцьцяўляць узаемны кантроль у Азіі, чым шукаць глябальных амбіцыяў.

Так што рэальнай альтэрнатывай для кіраўніцтва ЗША ў сьвеце ёсьць толькі хаос. Тыя, каго сёньня палохае неабмежаваная моц Амэрыкі, павінны зразумець, што хаос сьвету большы за моц Амэрыкі. ЗША могуць спрабаваць кантраляваць яго толькі да пэўнай ступені. Ўулфавіц ці Рамсфэлд ніколі ня стануць дыктатарамі плянэты.

І ніколі ня станецца так, што пры даміноўнай пазыцыі Амэрыкі іншыя краіны ня змогуць прасоўваць сваіх інтарэсаў. Францыя на працягу апошняй сотні год здольная была выкарыстоўваць Амэрыку тады, калі ёй гэта патрэбна, і сварыцца зь ёй, калі гэта нічым не пагражала. Амэрыканская гегемонія пакідае іншым шырокі выбар: частковай канкурэнцыі з ЗША альбо частковага супрацоўніцтва.

**— А можа, ЗША і ўвесь Захад павінны адмовіцца ад памкненьняў зьмяніць сьвет? Можа, маюць рацыю гэтак званыя рэалісты? Тыя, хто кажа, што калі нейкая краіна не пасьпявае за сучаснасьцю, калі ў ёй пануе бяспраўе і дыктатура, дык звонку няшмат можна зрабіць? Толькі чакаць, пакуль гэтае грамадзтва «пасталее»?**

— Гэтак можна было казаць у 40-я, калі сучасны сьвет ахопліваў, галоўным чынам, ЗША і Эўропу, і то ня ўсю, бо былі такія, хто пытаўся: «Чаму каталіцкая Эўропа ня можа мадэрнізавацца?»

Сёньня ў нас ёсьць ня толькі прыклады пасьпяховага эканамічнага росту і ўсталяваньня дэмакратыі ў Паўднёвай ці Цэнтральнай Эўропе, але таксама і ў шмат якіх краінах Азіі. Так што пасьпяховая трансфармацыя да сучаснасьці магчымая. Ці будзе яна ўсеагульная? Гэтага я ня ведаю.

Безумоўна, на зямлі ёсьць месцы, дзе на гэта трэба дзясяткі, а то і сотні гадоў. Эгіпет спрабаваў мадэрнізавацца з часу Напалеона. Чарговыя валадары распачыналі разнастайныя праекты, будавалі Суэцкі канал, зьмянялі школы, зьмянялі законы, рабілі ўсё, каб пасьпець за Захадам, але разрыў між Эгіптам і Францыяй сёньня большы, чым у напалеонаўскія часы.

Ці гэта азначае, што нельга было прымяняць у Эгіпце іншыя рэцэпты? Можа, і так. Што павінен Эгіпет спрабаваць цяпер? Мы ня ведаем. Гэта рэчаіснасьць гісторыі чалавецтва: мы ня ведаем адказаў на ўсе пытаньні. Тыя, хто спрабуюць знайсьці догмы, што ўсё растлумачаць, ці гэта нэакансэрватары, ці нэарэалісты, можа, і паляпшаюць сабе настрой, але разумнейшымі ад гэтага не становяцца.

*Пераклала Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl, скарочана. Поўны варыянт можна прачытаць на сайце nn.by.*

# Амэрыка, Амэрыка…

ЗША яшчэ доўга будуць дамінаваць у сьвеце. Піша **Віталь Тарас**.

*Подумаешь — ну, президент,*
*ну, соединенных штатов.*
*А все-таки — ведь Президент*
*Соединенных Штатов!*
***Дзьмітры Прыгаў***

## Ня колай адзінай

У найноўшай гісторыі нямала перакрыжаваньняў, хоць часам і невідавочных, між Беларусяй і ЗША. Два амэрыканскія прэзыдэнты — Рычард Ніксан на пачатку 1970-х (на шляху з Масквы ён наведаў Менск, а таксама Хатынь) і Біл Клінтан пры канцы 1990-х былі ў Беларусі. Пра візыт Клінтана нагадвае памятная лаўка ў Курапатах.

Зь Беларусяй зьвязана імя яшчэ аднаго прэзыдэнта — Джона Кенэдзі. У Менску доўгі час жыў будучы забойца прэзыдэнта Лі Гарві Освальд, які ажаніўся быў на беларусцы. Нямала менчукоў любяць успамінаць, як пры канцы 1950-х пілі з Освальдам гарэлку. З кожным годам «субутэльнікаў» робіцца больш — паводле тае самае заканамернасьці, аналягічна зь якой у Менску павялічваецца колькасьць вэтэранаў Другой сусьветнай вайны.

Былі й культурніцкія падзеі, што пакінулі сьлед у жыцьці менчукоў. Згадаю канцэрт аркестра Д'юка Элінгтана ў менскім Палацы спорту, выставу архітэктуры ЗША, на якую выстройваліся кілямэтровыя чэргі і пасьля якой галоўным клопатам менскіх настаўнікаў і выкладчыкаў зрабілася адбіраць у юнакоў значкі з выявай амэрыканскага сьцяга — іх дарылі ўсім наведнікам. Нельга не згадаць і выставы «Мастацтва ЗША XX ст.» і «Амэрыканскі жывапіс XVIII—XIX ст.». На першай шмат людзей упершыню ў жыцьці ўбачылі сапраўдны поп-арт, культавыя работы Эндзі Ўоргала, сярод якіх — знакаміты «размножаны» партрэт Мэрлін Манро.

Ну а развагі пра ўплыў блюзу й рок-н-ролу на некалькі пакаленьняў беларускай інтэлігенцыі можна ўвогуле апусьціць.

Тым ня менш, дазволю сабе сьцьвярджаць, што ў сьвядомасьці мільёнаў беларусаў ЗША асацыююцца найперш з каўбоем Мальбара, кока-колай і страўнямі «Макдоналдс» (карпарацыі, якая насамрэч мае штаб-кватэру ў Канадзе), чым з Джымі Хэндрыксам, Джэніс Джоплін і Джымам Морысанам.

БТ, якое штодня прысьвячае найбольшую колькасьць замежных сюжэтаў менавіта ЗША — прычым выразна нэгатыўных і адначасова прымітыўных, — рэгулярна дэманструе амэрыканскія фільмы.

Канешне, фармаваць меркаваньне аб жыцьці ў ЗША на падставе галівудзкіх фільмаў настолькі ж плённы занятак, як спрабаваць атрымаць зьвесткі аб рэаліях савецкага жыцьця зь фільму «Сьветлы шлях».

Пальму першынства ў фармаваньні «глянцавага» іміджу Амэрыкі сьлед аддаць самім амэрыканцам, то бок амэрыканскай рэкляме.

Так званыя сымбалі амэрыканскага ладу жыцьця кшталту гамбургераў і колы выкарыстоўваюцца антыамэрыканістамі рознага кшталту — ад дэпутата Касьцяна да беларускіх анархістаў — у якасьці доказаў бездухоўнасьці Захаду і праяваў імпэрыялізму й глябалізму. А звычайныя беларускія грамадзяне, выхаваныя на штампах антыамэрыканскае прапаганды, спакойна спажываюць кока-колу й хот-догі, носяць джынсы, езьдзяць на «фордах», глядзяць галівудзкія фільмы.

## ЗША? Дзе гэта?

Адзін хлапчук у электронным ліставаньні са сваім новым знаёмцам у Сеціве — амэрыканцам — жартам запытаўся: «Ты жывеш у ЗША? А дзе гэта?» (Перад тым амэрыканскі юнак пацікавіўся, дзе знаходзіцца Беларусь.) Амэрыканец быў шакаваны. Ён ня ведаў, як адказаць.

Ня толькі абсалютная большасьць амэрыканцаў ня ведае, дзе Беларусь, але й пераважная большасьць беларусаў цьмяна ўяўляюць, што такое Злучаныя Штаты Амэрыкі, колькі там штатаў і хто быў прэзыдэнтам да Буша-малодшага. Усеагульная неадукаванасьць, нягледзячы на існаваньне інтэрнэт-энцыкляпэдыяў, пашыраная ва ўсім сьвеце, і яе трэба прызнаць натуральнай.

Толькі невялікая колькасьць інтэлектуалаў у Беларусі чыталі Фолкнэра, Гэмінгўэя, Гінзбэрга. Яшчэ менш людзей чыталі іх у арыгінале. Яшчэ менш амэрыканцаў чыталі ці хаця б чулі пра Быкава, Барадуліна, Разанава.

Ёсьць і выняткі. Былы пасол Джордж Крол стаў, бадай, першым



PHOTO.BYMEDIA.NET

амэрыканскім дыпляматам, які ня толькі на словах палюбіў Беларусь і беларускую мову, але і пачаў ёю карыстацца.

У ЗША, дзякуючы некалькім хвалям эміграцыі ў XIX—XX ст., апынулася шмат нашых суайчыньнікаў. Але малая частка эмігрантаў імкнулася захаваць памяць пра беларускія карані. Знакаміты кампазытар Ісая Бэрлін, аўтар нефармальнага амэрыканскага гімну «Божа, блаславі Амэрыку», нарадзіўся пад Менскам. Ні для яго самога, ні для мільёнаў амэрыканцаў гэты факт ня меў і ня мае значэньня.

Толькі адна хваля эміграцыі — Другой сусьветнай вайны — прывяла да зьяўленьня ў ЗША дыяспары. Даволі малалікай і разьяднанай у параўнаньні зь іншымі, але дыяспары, у якой захоўваюцца мова і вернасьць беларускім традыцыям. Усе, хто прыяжджаў у Штаты да таго ці пазьней рана ці позна інтэграваліся ў амэрыканскае грамадзтва, перастаючы адчуваць сваю прыналежнасьць да сваёй нацыі. Што й ня дзіва, улічваючы нізкі ўзровень нацыянальнай самасьвядомасьці на радзіме.

Выключэньнем стаў Зянон Пазьняк, які ня змог ці не схацеў упісацца ў амэрыканскую дыяспару або заняць ў ЗША адмысловую нішу, накшталт той, якую здолеў заняць «вэрмонцкі пустэльнік» Салжаніцын.

Праўда, апошнім часам, з разьвіцьцём Інтэрнэту, сытуацыя перайначваецца, нямала беларускіх студэнтаў, якія навучаюцца ў ЗША (і маюць намер там застацца), удзельнічаюць у беларускіх форумах, цікавяцца палітычным і культурным жыцьцём Беларусі, ствараюць беларускамоўныя сайты.

Але гэта сытуацыі кардынальна не зьмяняе.

## Як ігнараваць Гольфстрым

Беларускае грамадзтва мала ведае аб заходнім у цэлым і грамадзтве ЗША ў прыватнасьці. БТ паказвае Буша, вайну ў Іраку, тэракты ў Аўганістане, гвалт у амэрыканскіх школах, пікеты ля Белага дому...

Дый кадры разгону мітынгаў, зьбіваньня мірных грамадзянаў на вуліцах, твар А.Лукашэнкі, якія нярэдка паказваюць CNN ці іншыя інфармацыйныя каналы на Захадзе, яшчэ не даюць, мякка кажучы, поўнага ўяўленьня пра Беларусь.

І калі б Беларусь зусім зьнікла з экранаў, як гэта ні сумна, мала хто ў ЗША заўважыў бы зьнікненьне. Уявіць сабе, што з экранаў беларускіх, расейскіх ці якіх заўгодна тэлеканалаў зьніклі паведамленьні аб ЗША, немагчыма. Гэта тое самае, што ігнараваць існаваньне надвор'я. Можна не задумвацца кожны дзень пра Атлянтычны акіян. Але ж немагчыма ня ўлічваць існаваньня Гольфстрыму, які нясе цыклёны ў Беларусь. Гэтаксама Беларусь ня можа ігнараваць палітыкі і ўплыву ЗША ў сьвеце.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Між тым, складваецца ўражаньне, што менавіта гэтым беспэрспэктыўным заняткам цягам апошніх дзесяці гадоў займаецца кіраўніцтва Беларусі. Калі няма як заваяваць прыязнасьці Белага дому, калі ЗША займаюць найбольш цьвёрдую і пасьлядоўную пазыцыю з усіх заходніх краінаў у дачыненьні да дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі — значыць, трэба давесьці, што беларускаму кіраўніцтву не патрэбныя міралюбныя ці хоць бы нармальныя партнэрскія дачыненьні з Амэрыкай. Што можна стварыць нейкі мітычны шматпалярны сьвет, наладзіць узаеміны з краінамі трэцяга сьвету — з ПАР, ці Вэнэсуэлай, з Расеяй, Кітаем асобнымі краінамі Захаду нават, але толькі не з ЗША. Але не засталося ніводнай краіны, якую б ізаляцыяніСцкую пазыцыю яна ні займала, якой не давялося б рана ці позна вызначацца ў стаўленьні да Амэрыкі. І не таму, што ЗША навязваюць свой шлях разьвіцьця астатнім. Проста Злучаныя Штаты застаюцца і ў пэрспэктыве яшчэ доўга будуць заставацца найбольш магутнай, дамінуючай дзяржавай у сьвеце — і ў эканамічным, і ў ваенна-стратэгічным, і, самае галоўнае, у інтэлектуальным сэнсе. Тое, што восемдзесят, а то й больш адсоткаў нобэлеўскіх прэміяў у навуцы штогод дастаюцца грамадзянам ЗША — усяго толькі канстатацыя гэтага факту.

Аднак гэта не азначае, што й беларускія палітыкі мусяць абмежавацца канстатацыяй статус-кво. На жаль, узаеміны паміж Вашынгтонам і Менскам нагадваюць вуліцу з аднабаковым рухам. І каб жа гэта тычыла толькі афіцыйных дачыненьняў. Урад ЗША, Кангрэс прымаюць дакумэнты і заявы ў падтрымку дэмакратыі і дэмакратычных партыяў, іх лідэраў, у абарону палітвязьняў. А што ў адказ? Справа ня ў тым, што апазыцыйныя палітыкі абавязаныя падтрымліваць палітыку Вашынгтону ва ўсіх пытаньнях. Ніхто ад іх гэтага й не чакае. Але й звычайна ўхвалы заяваў дзярждэпу замала. Яснай стратэгіі, бачаньня рэальных палітычных пэрспэктываў на будучыню, аналізу сытуацыі ўнутры краіны даўно чакаюць ад апазыцыі. І ня толькі прыхільная да яе частка электарату, але й дэмакратычныя ўрады Захаду. Найперш, урад ЗША, які, адрозна ад шмат якіх іншых урадаў, ужо не аднойчы засьведчыў сваю неабыякавасьць да лёсу Беларусі.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**27 (пт)** — «Чычыкаў».
**28 (сб)** — «Таполевая завея».
**29 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**30 (пн)** — «Сымон-музыка».
**1 (ср)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**2 (чц), 3 (пт)** — «Ідылія».
**4 (сб)** — «Вечар».
**5 (ндз)** — «Паўлінка».
*Ранішнія спэктаклі*
**29 (ндз)** — «Афрыка».
*Малая сцэна*
**28 (сб)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**4 (сб)** — «Муж для паэтэсы».

**Тэатар юнага гледача**
**27 (пт)** — «А зоры тут ціхія».
**28 (сб)** — «Залатое сэрцайка».
**2 (чц), 3 (пт)** — «Жураўліныя пёры».
**3 (пт)** — «Маленькія трагедыі».
**4 (сб)** — «Сястра мая Русалачка».
**5 (ндз)** — «Папялушка».
**5 (ндз)** — «Апошняя дуэль».

**Тэатар лялек**
**27 (пт), 28 (сб)** — «Кот у ботах».
**29 (ндз)** — «Прыгоды алавянага жаўнерыка, пастушкі і камінара».

**31 кастрычніка** ў ДК МТЗ (станцыя мэтро «Трактарны завод») мае адбыцца фэст

# «Halloween»



з удзелам гуртоў: Imprudence, Prophetic Dream, Nasoferus, Volk, Medea, Partyzone. Пачатак а 18:30.

Кошт квіткоў ад 8 000 да 12 000.

Той, хто набудзе квіток за 12 000, атрымае ў падарунак кампакт-дыск!

Продаж квіткоў — пераход на Я.Коласа.

## ВЫСТАВЫ

**Тэхна-Арт. Новыя грані**
У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) **да 12 лістапада** працуе выстава «Тэхна-арт. Новыя грані». У адной выставачнай прасторы паказаныя творы, створаныя з выкарыстаньнем кампутарнай графікі, лічбавага фота, фотамантажу, 3-D анімацыі, фота-арт-фільмы, арт-аб'екты.

**Тыдзень італьянскай мовы ў сьвеце**
**З 1 да 10 лістапада** ў Доме дружбы (вул.Захарава, 28) адбудзецца выстава дызайнэра-мадэльера Кена Скота ў рамках VI Тыдня італьянскай мовы ў сьвеце.

## КАНЦЭРТ

**Хіп-хоп вакацыі**
**3 лістапада** а 18-й у клюбе «Акварыюм» (вул.Кульман,14) пройдзе першы фэст беларускамоўнай РЭП і хіп-хоп культуры. Квіткі: 8–10 тыс. Першыя 100 чалавек, хто набудзе квіткі папярэдне, атрымаюць у падарунак кампакт-дыск!!! Даведкі праз т.: 649-08-88 і 775-36-08.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 28 кастрычніка

**«Лад», 09.20**

«Каралеўства крывых люстэркаў».

Расея (СССР), 1963, рэж. Аляксандар Роў.

Казка паводле кнігі Віталя Губарава.

Дзяўчынка Вольга трапляе ў Каралеўства Крывых Люстэркаў, дзе разам са сваім адбіткам Яло выратоўвае хлопчыка Гурда й робіць рэвалюцыю...

Выдатная казка зь яскравымі касьцюмамі й дасьціпнай ігрой.

Ролі выконваюць: Вольга і Таня Юкіны, Лідзія Вярцінская, Георгі Міляр, Аляксандар Хвыля.

**«Лад», 19.00**

«Тыгр і сьнег».

Італія, 2005, рэж. Рабэрта Бэніні.

Трагікамэдыя.

Паэт Аціла сустракае сваю музу Вікторыю, якую ён раней бачыў толькі ў снах. Але жанчына трапляе ў іракскі палон. Недарэка-паэт рушыць на вызваленьне, ня ведаючы ані слова па-арабску.

Сумная антывайсковая трагікамэдыя ад італьянскага коміка.

**БТ, 19.10**

«Няўлоўны».

Францыя, 2005, рэж. Жэром Сталь.

Крымінальная мэлядрама.

Франсуа закаханы ў К'яру. Але дзяўчына выкарыстоўвае яго, каб выдаваць за свайго зьніклага мужа, якога шукае мафія і паліцыя. Няглёдзячы на падман, Франсуа гатовы аддаць усё, абы толькі дакрануцца да К'яры.

Ролі выконваюць: Сафі Марсо, Айвал Атал, Даніэль Альбрыскі.

**«Лад», 21.25**

«Сьціплая прывабнасьць буржуазіі».

Францыя, 1972, рэж. Люіс Бунюэль.

Сюррэалістычная драма.

Добрапрыстойная буржуазная кампанія сабралася паабедаць... Але не выпадае: то хаўтуры, то кашмары, то тэрарысты...

Гэта трэба глядзець! Фарсавая заблытанасьць сноў, зьдзеклівая геніяльнасьць Бунюэля і чыстае кіно ў сюррэалістычных шатах.

**СТВ, 00.15**

«Сарабанда».

Швэцыя—Нямеччына—Данія, 2003, рэж. Інгмар Бэргман.

Псыхалягічная драма.

Былыя муж і жонка ізноў сустракаюцца, але ў сям'і насьпявае новы канфлікт...

Геніяльны рэжысэр Інгмар Бэргман не патрабуе, каб яго прэзэнтавалі.

### Нядзеля, 29 кастрычніка

**СТВ, 20.45**

«Удалечыні ад раю».

ЗША—Францыя, 2002, рэж. Тод Хэйнз.

Мэлядрама.

50-я гады. Кэці жыве ідэальным жыцьцём хатняе гаспадыні. Але, шакаваная здрадай мужа з другім мужчынам, яна спакушае чарнаскурага садоўніка. Мястэчка поўніцца плёткамі. Муж і жонка спрабуюць выратаваць свой шлюб...

Тод Хэйнз («Атрута», «Бясьпека») — адзін з самых таленавітых амэрыканскіх рэжысэраў, хаця ў Беларусі малавядомы.

Ролі выконваюць: Джуліяна Мур, Дэніс Кўэйд.

Фільм атрымаў 4 прызы на кінафэсьце ў Вэнэцыі. Намінацыі на 4 «Оскары» і 4 намінацыі на «Залаты глёбус».

**АНТ, 21.35**

«Грабеж па-француску».

Францыя—Канада—Вялікабрытанія, 2003, рэж. Брэд Мірман.

Крымінальная камэдыя.

Недарэкі-злодзеі выпадкова падпалілі кватэру, тушылі пажар каштоўнай карцінай — і абудзілі гаспадара са зброяй...

Акторскія забавы ад Жэрара Дэпард'ё, Гарві Кейтэля і Джоні Голідэя.

**БТ, 22.25**

«Экспэрымэнт».

Нямеччына, 2001, рэж. Олівэр Хіршбігель.

Псыхалягічны трымценьнік.

Падчас навуковага экспэрымэнту адна група людзей грае зьняволеных, а другая — наглядчыкаў. Але неўзабаве экспэрымэнт выходзіць з-пад кантролю...

Шокавы трымценьнік пра карані ўлады, рабства й бунту. Фільм адштурхоўваецца ад рэальнага навуковага экспэрымэнту.

Надзвычай актуальная карціна для Беларусі.

**Андрэй Расінскі**

## СТАГОДЗЬДЗЕ «НАШАЙ НІВЫ»

### Выстава Міколы Купавы

Запрашаем на выставу Міколы Купавы, прысьвечаную 100-годзьдзю беларускіх газэт «Наша Доля» і «Наша Ніва» ў Літаратурным музэі Максіма Багдановіча (вул.М.Багдановіча, 7а).

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Чорны Пальма

**Чорная архідэя** (Black Dahlia).

**ЗША—Нямеччына, 2006, каляровы з чорна-белым, 120 хв.**

**Жанр: фільм-нуар паводле раману Джэймза Элроя.**

**Адзнака:** 5,5 (з 10).

1947 год. Два паліцэйскія расьследуюць забойства акторкі. Вышук прыводзіць іх у галівудзкі багаты дом, да каханак — і ўзаемнага выкрыцьця...

Карціна Браяна Дэ Пальмы — спроба вярнуцца ў залатыя часы фільмаў нуар. Росквіт чорных карцінаў прыйшоўся на саракавыя гады, калі людзі добра памяталі Вялікую Дэпрэсію й гангстэрызм. Эталёны фільмаў нуар — «Мальтыйскі сокал» з Гэмфры Богардам і «Падвойная страхоўка». У 70-я Раман Палянскі паўтарыў посьпех чорных карцінаў стужкаю «Кітайскі квартал».

Нарэшце, да жанру зьвярнуўся й майстар трымценьнікаў Браян Дэ Пальма.

Атмасфэра ў такіх фільмаў змрочная, фатальна-пэсымістычная, асьвятленьне начное. Учынкі працятыя здрадай і жарсьцямі. Герой не адрозьніваецца ад антыгероя, а жанчына — спакушальна-цынічны вораг.

Усё гэта ў фільме Дэ Пальмы ёсьць.

Нуараўскі крымінальны трохкутнік ускладнены «раманам» зь мёртвай акторкай, якае мае жывога двайніка — чарняўку з шыкоўнымі валасамі (Гілары Сўонк). Процілегласьць ёй — фатальная бляндынка (стылёва-выкшталцоная ігра Скарлет Ёхансан). Здрада пакрывае здраду, падман ідзе за падставай.

Браян Дэ Пальма ўдала грае з эпохаю, Галівудам і жанрам.

Але ў сэрцы «Чорнае архідэі» — далікатная імітацыя. Джош Гартнэт і Аарон Экгарт — ня Гэмфры Богард. А фраза «Ты мяне хочаш трахнуць, а не забіць» у вуснах фатальнае прыгажуні — не адпавядае аўры саракавых.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**КЭНДЗІ** (Candy)
Драма, Аўстралія, 2006, рэж. **Ніл Армфілд.**
У ролях: **Гіт Лэджэр, Эбі Корніш, Джэфры Раш.**
Мастачка Кэндзі закаханая ў паэта Дэна. Вось толькі сябрам герояў ёсьць гераін. Што пераможа: наркотыкі ці каханьне?
Карціна — удзельнік Бэрлінскага кінафэсту.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**




## КАІСА

# Сэанс на дзьвюх дошках

Плянаваў назваць нататку пра Чэмпіянат сьвету ў Элісьце «Двубой гіганцкіх карлікаў», маючы на ўвазе, што Крамнік з Тапалавым стаяць на плячах вялікіх шахматыстаў мінулага. Аднак хада спаборніцтва змусіла расставіць акцэнты іначай. У матчы псыхалёгія і юрыспрудэнцыя дамінавалі над шахматамі, і простае пытаньне — ці мае шахматыст права ў час партыі пабыць на самоце — ледзь не павярнулася зрывам усёй імпрэзы.

Камэнтатары «туалетнага скандалу» абрыналіся на тапалаўскага імпрэсарыё Данаілава (які нібыта ўсю куцьцю і заварыў) або проста канстатавалі наяўнасьць у вялікіх шахматах «бруду». Як сказаў расейскі гросмайстар Грышчук: «Упершыню мне стала сорамна, што я шахматыст». Адзначу тое, што ня ўсім кінулася ў вочы. Па-першае, у падтрымку Крамніка пасьля таго, як Ілюмжынаў пазбавіў яго балу за дэманстратыўную няяўку на 5-ю партыю, выступілі «заклятыя сябры» Карпаў і Карчной. Па-другое, Тапалаў, даўшы Данаілаву карт-блянш на «легальныя» захады супраць Крамніка, неўзабаве сам пашкадаваў пра тое. Відаць, зразумеў, што змагаецца ня з тым супернікам.

Удзельнікі змагаліся ня толькі міжсобку, а і зь бюракратычнай машынай. Выйгрыш Уладзімерам Крамнікам «аб'яднаўчага» матчу пад эгідай ФІДЭ часова здымае вастрыню даўняга канфлікту паміж гульцамі і шахматнымі чыноўнікамі, — канфлікту, што ўлучаў дыскваліфікацыі чэмпіёнаў сьвету, ганебныя саступкі дыктатарам, навязваньне штучных правілаў... Але няма падставаў верыць, што гэная «партыя» скончылася. У варунках, калі за Крамніка — бальшыня знакавых асобаў, яму варта было б выйсьці зь ФІДЭ ды пацягнуць за сабою калегаў. Ясна, ня дзеля расколу: дзеля заснаваньня новай, больш справядлівай сыстэмы сусьветных шахмат. Дарабіць тое, што ў 90-х не ўдалося імпульсіўнаму Гары Каспараву.

Што да шахматнага зьместу матчу, адметна, што ўсе партыі пачыналіся славянскай абаронай (1. d4 d5 2. c4 c6). Расеец выявіўся гульцом ласкераўскага маштабу, схільным да выкарыстаньня чужых памылак. Баўгарын гуляў імпэтна, але няроўна, акурат ураджэнец Ваўкавыску Давід Яноўскі ў час першай «Нашай Нівы». Для маткі-гісторыі каштоўныя абодва.

**Вольф Рубінчык**

### Як бы вы згулялі?

В. Тапалаў (2813) — У. Крамнік (2743), Эліста, 2006. Ход белых.



**Адказ:** 1. Тg4+ Сg7 2. Фc7! Фf1+ 3. Кg1. Чорным пара здацца. Баўгарскі гулец даў іншы шах: 1. Фg6+ і пасьля 1...Сg7 нават прайграў.

# Дзякуй за ахвяраваньні

**А.С., Георгію Ш., Анатолю М., Ірыне В., Генадзю П., Л.С., І.Л., А.С., Г.М., Яўгену Л., Канстанціну Т., Аляксандру П., Андрэю Ш., В.А., Галіне Ж., Ірыне Д., В.К., Фэліксу Г., Тацяне Н., А.Л., А.Г., О.К., Алесі С., Ігару М., С.Ж., Натальлі Ц., Л.К., Уладзімеру З., Ксеніі Д., Міколу В., Г.Л., Віталю З., В.Л., Ганьне К., Івану С., А.М., Яўгену Р.** зь Менску.

**Валянціне С.** з Жодзіна.

**Аляксандру Ш.** зь Верхнядзьвінскага раёну.

**Юлі С.** з Паставаў.

**Міколу Р.** са Жлобіна.

**Крысьціне М., В.П., Тацяне Р.,** з Горадні.

**Яўгеніі Я., Дзянісу К.** з Гомеля.

**Уладлене Д.** з Кобрына.

**Вользе К.** зь Берастаўіцкага раёну.
**Вользе А.** зь Любанскага раёну.
**Мар’яну М.** зь Лідзкага раёну.
**Вячаславу К., Іне С.** з Барысава.
**Любові Ш., Паўлу Ю.** зь Віцебску.
**З.С.** з Воршы.
**Валянціне М.** зь Лепелю.
**А.Б.** з Ваўкавыску.
**Тадэвушу Ш.** з Маладэчна.
**Зьмітру К.** з Мастоў.
**Ірыне Б.** з Глыбоцкага раёну.
**С.М., В.Б., С.М.** са Шчучына.
**Алене П., І.Ш., Ірыне Я., Міколу Б., Аляксандру М., Міхаілу Г.** зь Берасьця.
**А.Я.** з Бабруйску.
**Алене А., Віктару М., Валеру П., С.Ц., Сяргею П.** з Баранавічаў.
**Аляксандру Ц.** з Шумілінскага раёну.
**Адзе Р.** з Шаркаўшчыкскага раёну.

**Андрэю А.** зь Менскага раёну.
**Н.Б.** з Астравецкага раёну.
**Паўлу Л.** з Хойніцкага раёну.
**Алене Х., Алесь М.** з Наваполацку.
**Аляксею В.** з Салігорску.
**Зьмітру К.** зь Віцебскага раёну.
**Міколу В.** з Пружанскага раёну.
**Ганьне Б.** з Пастаўскага раёну.
**Віктару М.** з Полацкага раёну.

Дыяна Леанідаўна зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар сваёй кватэры.

М.В.Е. з вуліцы 17 верасьня, удакладніце адрас.

С.В.А. з Радашкавічаў, дашліце дакладны адрас.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 — Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3015 212 000 012 — Асабовы рахунак: ______

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакаазу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпе-чаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.




**...мытнікі атрымлівалі прэмію 300 000 рублёў за адмову ад кожнага прапанаванага хабару...**



**...піянэр Марат Казей ведаў, што ягоная арганізацыя калі-небудзь аб'яднаецца з БРСМ...**

«За Радзіму! За самаакупнасьць моладзевых арганізацый!»

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Сабачыя гісторыі

Адзін Сабака, даведаўшыся, што Нобэля атрымаў турак, паслаў яму віншавальную тэлеграму. А Граждан напісаў пісьмо: «Мілы папаня Архан, я ваш незаконнанароджаны лейтэнант Шніп, забярыце мяне адселя, бо няма ўжо мочы глядзець на нашы Шахеразады...»

***

Адзін Сабака ішоў на зьезд пісьменьнікаў. Сьледам плёўся Граждан і шаптаў: «Не хадзі туды. Там кірпіч башка, зусім мёртвы будзеш...»

***

Аднаго Сабаку выбралі кіраўніком Саюзу пісьменьнікаў. Граждан адразу ж паслаў яму тэлеграму: «Я вас любіў, любоў мая, быць можа, у душы пагасла не саўсім, але яна няхай вас не трывожа, я не пячатаюсь саўсім!»

***

Адзін Сабака на Дзяды схадзіў у царкву. Граждан цэлыя суткі не выходзіў з кватэры — днём піў самагонку, а потым зь вечара аж да раніцы рабіў «начныя налёты на Рыгу».

***

З надыходам халадоў адзін Сабака ўсунуў цёплую вопратку. А Граждан распрануўся дагала, выйшаў на балкон і сказаў: «Я такой другой страны ня знаю, гдзе так вольна дышыць чалавек...»

***

Адзін Сабака купіў у Граждана мяшок бульбы. Прынёс дамоў, а бульба і кажа: «Гражданы ўсіх палёў, аб'ядайцеся!»

***

Адзін Сабака напісаў у газэце, што на сёньняшні дзень у кожнага ёсьць свая цыбуліна. Граждан прачытаў гэта і сказаў: «А ў мяне ёсьць дзьве цыбуліны і шматок жоўтага сала...»

**Vik**

## ТЭМА

### Буш прычынай высокіх цэнаў на нафту?

Гутарка з палітолягам Дзянісам Мельянцовым пра сучасную Амэрыку і ўплыў яе замежнай палітыкі на сытуацыю ў Беларусі.

### Ці ёсьць альтэрнатыва дамінацыі ЗША?

Так. Гэта хаос, — мяркуе Ўолтэр Расэл Мід.

### Амэрыка нічым ня лепшая за іншыя імпэрыі

Свой уласны тэрарызм Амэрыка называе барацьбой з тэрарызмам, – кажа амэрыканскі дысыдэнт нумар адзін Наам Хомскі.



### Амэрыка, Амэрыка...

Процілеглыя меркаваньні пра ЗША і яе ўплыў на сьвет і Беларусь на палосах «Камэнтароў і меркаваньняў» — **старонкі 19—27**.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ХАТКА

**Куплю хатку** ў вёсцы непадалек ад Менску. Т.: 569–72–16 (МТС), 254–73–88 (хатні). Аляксандар

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў сяброўскае падарожжа 12 лістапада (нядзеля) «Замкі Беларусі»: Менск—Мір—Шчорсы—Любча—Наваградак—Уселюб—Ліда—Менск. 19 лістапада (нядзеля): Залесьсе—Смургонь—Солы—Гервяты—Міхалішкі—Сьвір—Засьвір. Т.: 292–54–58, 110–19–28, 573–88–17, 622–57–20

### ВІТАНЬНІ

**Танечка Клікун!** З Днём народзінаў цябе! Няхай карабель твайго жыцьця салодка гушкаецца на празрыстых хвалях — досыць вялікіх, каб жыцьцёвы акіян не зацягнуўся раскаю, і досыць малых, каб табе не давялося трапіць у чорную навальніцу... Т., infocom

### ШКОЛКА

**Алена Церашкова** запрашае трохгадовых і крыху старэйшых дзетак у беларускамоўную школку раньняга разьвіцьця й падрыхтоўкі да школы. Правераныя часам мэтодыкі навучаньня сьпевам, маляваньню, чытаньню ды матэматыцы, разьвіцьцё мовы ды лёгікі і проста магчымасьць кантакту зь беларускамоўнымі аднагодкамі! 5—6 дзетак у групе. Займаемся па суботах, хутчэй далучайцеся! Добразычлівае стаўленьне гарантуецца! Цэнтар гораду (2 хвіліны ад мэтро). Кантакт 8–029–385–66–70. Вельмі чакаем!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У лесе Немэнчынскага лясьнічаства паявіўся шалёны чалавек і, як кажуць, быццам-то пакусаў адну кабету, каторая ехала зь Вільні, а посьле гнаўся за бабамі, што зьбіралі грыбы. Цяпер акалічныя жыцелі баяцца ісьці ў лес, а найбольш кабеты, каторым і грыбоў хочацца, але і скура свая дорага. Гаспадары цешацца, што ёсьць каму бульбу капаць.

Біч.

**«Наша Ніва». №39. 1911**

# А ты падпішыся!




**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

ТДА «Юніёнлайн» і Антось Астаповіч запрашаюць у вандроўку 12.11.2006. **Ліда — Белагруда — Вавёрка — Малы Мажэйкаў — Мураванка.** Працягласьць вандроўкі — 13 гадзін (з 7-й па 20-ю). Кошт: 31 000 беларускіх рублёў. Т. 111–73–32, 224–05–44.

Ліцэнзія №02310/0277540, выдадзеная 24.02.2006

ТДА «Юніёнлайн» і Антось Астаповіч запрашаюць у вандроўку 19.11.2006. **Рубяжэвічы — Дзераўная — Стоўпцы — Новы Сьвержань — Радзіма Якуба Коласа.** Працягласьць вандроўкі — 10 гадзін (з 8-й па 18-ю). Кошт: 28 000 беларускіх рублёў. Т. 111–73–32, 224–05–44.

Ліц. №02310/0277540, выд. 24.02.2006

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2621. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.10.2006.
Замова № 5971.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.